iSANS | The International Strategic Action Network for Security

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

## Агляд асноўных падзей і тэндэнцый за верасень 2024 года

**Гэтае даследаванне ўяўляе сабой агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам верасня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці.**

У верасні былі выяўлены такія тэндэнцыі:

- **Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры афіцыйных беларускіх уладаў па-ранейшаму застаецца амаль цалкам манапалізаваным Расіяй.**

У верасні 2024 года ў Telegram-канале Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі змешчаны 83 арыгінальныя навіны (ў папярэднім месяцы — 44), якія тычацца міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.

| **Краіна** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Расія | 71 (у папярэднім месяцы — 25) |
| Кітай | 4 |
| Зімбабвэ | 2 |
| Малдова | 1 |
| В’етнам | 1 |
| Нікарагуа | 1 |
| Куба | 1 |
| Егіпет | 1 |
| БРІКС | 1 |

Галоўным для Беларусі партнёрам у культурнай сферы па-ранейшаму застаецца Расійская Федэрацыя. У верасні прайшлі шматлікія супольныя беларуска-расійскія мерапрыемствы, сярод якіх: Дні Екацярынбурга ў Мінску[1], Дні Віцебскай вобласці ў Пскове[2], XVII фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву»[3,4,5,6], X Санкт-Пецярбургскі міжнародны форум аб’яднаных культур[7], Дні культуры Беларусі ў

[1] https://soyuz.by/obshchestvo/v-minske-proydut-dni-ekaterinburga-1
[2] https://t.me/minkultrb/41480
[3] https://t.me/minkultrb/41793
[4] https://t.me/minkultrb/41822
[5] https://t.me/minkultrb/41864
[6] https://t.me/minkultrb/41929
[7] https://t.me/minkultrb/41819

Навасібірску[8,9,10,11,12,13,14,15,16,17,18,19,20,21,22], XVII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі СНД ва Уфе[23], Дні Крыма з нагоды «10-гадовага юбілею ўз'яднання паўвострава з Расіяй» у Віцебску і Берасці[24,25] і іншыя. Мемарандумы аб супрацоўніцтве падпісалі: Вялікі тэатр Беларусі і Чувашскі дзяржаўны тэатр оперы і балета «Волга Опера»[26], Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі і Цэнтр творчага развіцця і музычна-эстэтычнай адукацыі дзяцей і юнацтва «Радасць» (РФ)[27]. Беларусь і Калужская вобласць падпісалі новы план сумесных мерапрыемстваў на 2024-2026 гады[28].

Таксама можна гаварыць пра намаганні беларускіх уладаў наладзіць стасункі (ў тым ліку культурніцкія) з усходнімі і афрыканскімі краінамі: Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства спорту, мастацтва і культуры Рэспублікі Зімбабвэ дамовіліся падпісаць міжведамаснае пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры[29], Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства культуры Арабскай Рэспублікі Егіпет дамовіліся аднавіць практыку правядзення абменных Дзён культуры[30], Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Маўзалей Сунь Ятсена (г. Нанкін, Кітай) дамовіліся аб супрацоўніцтве ў навукова-экспазіцыйнай дзейнасці[31] і г. д.

Што тычыцца супрацоўніцтва з заходнімі краінамі, то цягам месяца такіх выпадкаў ізноў не было зафіксавана.

- **Расія, (пра)расійскія арганізацыі і актывісты не спыняюць сваю актыўнасць, праводзячы ў Беларусі экспансію расійскай культуры і рускай мовы і ствараючы падмурак для далейшай інтэграцыі праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг і г. д.**

  У перыяд з 1 па 30 верасня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

---

[8] https://t.me/minkultrb/42361
[9] https://t.me/minkultrb/42473
[10] https://t.me/minkultrb/42475
[11] https://t.me/minkultrb/42487
[12] https://t.me/minkultrb/42492
[13] https://t.me/minkultrb/42508
[14] https://t.me/minkultrb/42509
[15] https://t.me/minkultrb/42510
[16] https://t.me/minkultrb/42511
[17] https://t.me/minkultrb/42514
[18] https://t.me/minkultrb/42516
[19] https://t.me/minkultrb/42517
[20] https://t.me/minkultrb/42518
[21] https://t.me/minkultrb/42527
[22] https://t.me/minkultrb/42551
[23] https://belta.by/society/view/forum-tvorcheskoj-i-nauchnoj-intelligentsii-sng-projdet-17-19-sentjabrja-v-ufe-661460-2024/
[24] https://www.svaboda.org/a/33135840.html
[25] https://t.me/russkoebelarus/3206
[26] https://t.me/minkultrb/41923
[27] https://t.me/minkultrb/42570
[28] https://t.me/ontnews/157992
[29] https://t.me/minkultrb/41921
[30] https://t.me/minkultrb/41936
[31] https://t.me/minkultrb/42334

- мерапрыемствы, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны[32,33,34,35,36,37,38].

- навязванне рускай мовы і літаратуры: выстава «Руская літаратура: ад класікі да сучаснасці»[39], акцыя «Літаратурная дыктоўка»[40,41,42], сустрэчы ў размоўным клубе «Рускі як замежны»[43,44], акцыя «Бібліяноч»[45].

- перадача ў фонды бібліятэк расійскіх выданняў і мастацкай літаратуры[46,47,48,49].

- паказ беларускім школьнікам расійскіх фільмаў[50,51,52].

- мерапрыемства, прысвечанае Сусветнаму дню рускага яднання[53,54].

- папулярызацыя рускай народнай культуры: мезенскага роспісу[55,56], рукадзелля[57], народнага танцу[58].

- **Працягваецца працэс уніфікацыі гістарычных навук Беларусі і Расіі.**

  - Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр гістарычнай памяці пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы захавання гістарычнай памяці, процідзеяння скажэнню гістарычнай праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны і генацыдзе савецкага народа[59].

- **Назіраецца павышаная ўвага дзяржавы да нацыянальнай гістарыяграфіі.**

  Беларускія ўлады няспынна перапісваюць гісторыю Беларусі згодна з найноўшымі ідэалагічнымі наратывамі і ва ўгоду беларуска-расійскай інтэграцыі, бяруць пад татальны кантроль любы распаўсюд гістарычных ведаў. *«Мы вызначыліся з падыходамі да гісторыі беларускай дзяржаўнасці, у цэлым — дзяржаўнай палітыкі ў сферы гісторыі»*[60] — заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас прэзентацыі канцэпцыі новага

[32] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14751
[33] https://t.me/russiangomel/4732
[34] https://t.me/RusConsBrest/3700
[35] https://t.me/rcnkbrest/24073
[36] https://t.me/rcnkbrest/24253
[37] https://t.me/russkiydomvgrodno/1898
[38] https://t.me/russiangomel/5100
[39] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14928
[40] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14950
[41] https://t.me/russkiydomvgrodno/1952
[42] https://t.me/libraryofbel/4689
[43] https://t.me/russiangomel/4826
[44] https://t.me/russiangomel/5130
[45] https://t.me/russiangomel/5138
[46] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14686
[47] https://t.me/russiangomel/4764
[48] https://t.me/russiangomel/4898
[49] https://t.me/russiangomel/5007
[50] https://t.me/russiangomel/5026
[51] https://t.me/russkiydomvgrodno/1821
[52] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14883
[53] https://t.me/russkiydomvgrodno/1834
[54] https://t.me/russkiydomvgrodno/1840
[55] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14712
[56] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14775
[57] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14808
[58] https://t.me/russkiydomvgrodno/1934
[59] https://t.me/rcnkbrest/24182
[60] https://t.me/minkultrb/41675

будынка Нацыянальнага гістарычнага музея[61,62] і дадаў, што ў змесце экспазіцыі музея *«не павінна быць ніякага нацыяналістычнага або ўра-патрыятычнага перахлёсту»*[63].

- зноў фіксуюцца выпадкі вандалізму на месцах масавых пахаванняў ахвяр сталінскіх рэпрэсій, гэтым разам невядомыя знішчылі крыжы і стэнды ў «віцебскіх Курапатах»[64].

- Лукашэнкаўскія прапагандысты, расійскія і прарасійскія актывісты чарговы раз паспрабавалі абвергнуць значнасць для беларускай гісторыі Аршанскай бітвы 1514 года[65,66] і зноў змагаліся з нацыянальным героем Беларусі Кастусём Каліноўскім[67,68,69]. Тым часам у Беларусі працягваюць усхваляць савецкіх і расійскіх дзеячаў: Фелікса Дзяржынскага[70], расійскага камуніста Сяргея Кірава[71]. А былы палітвязень расказаў пра расійскі трыкалор, сцяг СССР, партрэты Сталіна і Дзяржынскага ў кабінеце ГУБАЗіК[72].

- **У ідэалагічнай сферы адбываецца сакралізацыя савецкага мінулага, вялікая ўвага па-ранейшаму надаецца тэме Вялікай айчыннай вайны:**

- Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала выставу савецкіх плакатаў[73], адкрыла серыю кніжных выстаў да 80-годдзя Вялікай Перамогі ва ўстановах адукацыі[74,75,76,77,78,79].

- Пракуратура Гродзенскай вобласці запатрабавала «ўдасканаліць» гісторыка-культурны турызм і ўключыць у экскурсійныя маршруты наведванне помнікаў Вялікай Айчыннай вайны[80].

- мелі месца спектаклі[81], выставы[82,83] і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны.

- 17 верасня шырока адзначаўся Дзень народнага адзінства. Адбыліся выставы: «Назаўжды разам» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі)[84], «У адзінстве народа — сіла краіны» (Магілёўскі абласны мастацкі музей імя

---

[61] https://reformby.org/lukashenko-sobiraetsja-stroit-novyj-istoricheskij-muzej-na-meste-drimljenda
[62] https://nashaniva.com/350771
[63] https://t.me/minkultrb/41676
[64] https://nashaniva.com/350886
[65] https://t.me/historiographe/15117
[66] https://t.me/Gigin_Vadim/1830
[67] https://t.me/shpakouski/5138
[68] https://t.me/dzermant/8707
[69] https://t.me/AzarenokCTV/35941
[70] https://t.me/LyceumBSU/1944
[71] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/naviny/gomelskoe-podsankcionnoe-predprijatie-vernulo-pamjatnik-kirovu-na-territoriju-zavoda.html
[72] https://spring96.org/be/news/116335
[73] https://t.me/libraryofbel/4231
[74] https://t.me/libraryofbel/4219
[75] https://t.me/libraryofbel/4226
[76] https://t.me/libraryofbel/4236
[77] https://t.me/libraryofbel/4243
[78] https://t.me/libraryofbel/4257
[79] https://t.me/libraryofbel/4264
[80] https://amp-euroradio-fm.cdn.ampproject.org/c/s/amp.euroradio.fm/grodzenskaya-prakuratura-patrabue-udaskanalic-gistoryka-kulturny-turyzm
[81] https://t.me/minkultrb/42387
[82] https://t.me/minkultrb/42469
[83] https://t.me/minkultrb/42604
[84] https://t.me/libraryofbel/4496

Масленікава[85], «Вобраз Радзімы любімай» і выстава адной карціны — твора Маноса Ісакавіча Манасзона «Сустрэча савецкіх танкістаў у Заходняй Беларусі»[86] (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь)[87], выставачны праект, прымеркаваны да 85-годдзя ўз’яднання беларускага народа (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь)[88], тэматычныя мерапрыемствы: лекцыя «Сяргей Прытыцкі і “Чырвонае лісце”» (Музей гісторыі беларускага кіно)[89], культурна-патрыятычная акцыя «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць»[90] і адзіны дзень інфармавання на тэму «Мы разам назаўжды: да 85-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі і БССР» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі)[91], лекцыя з такой жа назвай (Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна)[92], рэспубліканскі навукова-практычны семінар (Нацыянальны гістарычны музей Беларусі)[93]. У Бешанковічах у Дзень народнага адзінства пасля рэканструкцыі адкрылі Раённы цэнтр культуры і Алею Славы[94], а ў Магілёве — праспект «17-га верасня»[95].

- **Па-ранейшаму назіраецца папулярызацыя рускай мовы і стварэнне адзінай (руска)моўнай прасторы.**

  За верасень 2024 года афіцыйны тэлеграм-канал[96] Міністэрства культуры апублікаваў 302 навіны (ў папярэднім месяцы — 261). Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| Мова паведамленняў | колькасць навін |
|---|---|
| Руская | 223 |
| Беларуская | 68 |
| Абедзве | 11 |

  - Тэлеграм-чат «Беларускамоўныя» прызналі «экстрэмісцкім»[97].

- **Беларуская нацыянальная культура ўсё больш прывязваецца да расійскай і працягвае існаваць ва ўмовах рэпрэсій і забарон.**

  ***Беларуская літаратура:***

[85] https://t.me/minkultrb/41810
[86] https://t.me/minkultrb/42006
[87] https://t.me/minkultrb/41823
[88] https://t.me/minkultrb/42037
[89] https://t.me/minkultrb/42053
[90] https://t.me/libraryofbel/4502
[91] https://t.me/libraryofbel/4640
[92] https://t.me/minkultrb/42033
[93] https://t.me/minkultrb/41838
[94] https://t.me/minkultrb/42087
[95] https://t.me/euroradio/57032
[96] https://t.me/MinobrofBelarus
[97] https://t.me/viasna96/27530

- Былы палітвязень расказаў, што ў калоніі пад Магілёвам спалілі дзве тачкі беларускіх кніг[98].

***Нацыянальная кінаіндустрыя:***

- у дзяржаўных СМІ шырока асвятлялася прэм’ера новай працы кінастудыі «Беларусьфільм» — прапагандысцкага фільма «Культурны код». У Мінску падчас паказу фільма зала стоячы спявала дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь разам з героямі фільма. Фільм прэзентавалі ў розных гарадах Беларусі[99,100,101,102,103,104,105,106].

- «Беларусьфільм» прадставіў трэйлер «Чорнага замка» — рускамоўнай экранізацыі рамана Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі», створанай расійскім рэжысёрам з расійскімі акцёрамі ў галоўных ролях[107,108,109].

- «Беларусьфільм» разам з «Татаркіно» плануе зняць фільм пра вайну ва Украіне[110], а Якуцiя прапанавала Беларусі супрацоўніцтва ў сферы кінавытворчасці[111].

**Гэтыя тэндэнцыі могуць мець для Беларусі сур’ёзныя наступствы, паколькі яны накіраваны на страту яе самабытнасці, на стварэнне ўмоў для далейшай інтэграцыі з Расіяй. А пры адначаснай экспансіі расійскай культуры — і на знікненне ў ёй. Беларусь паступова страчвае сваю нацыянальную індывідуальнасць.**

[98] https://www.svaboda.org/a/33136102.html
[99] https://t.me/minkultrb/41627
[100] https://t.me/minkultrb/41643
[101] https://t.me/minkultrb/41654
[102] https://t.me/minkultrb/41666
[103] https://t.me/minkultrb/41670
[104] https://t.me/minkultrb/41645
[105] https://t.me/minkultrb/41631
[106] https://t.me/holybelawood/4781
[107] https://t.me/holybelawood/4797
[108] https://t.me/euroradio/56933
[109] https://nashaniva.com/351144
[110] https://t.me/holybelawood/4801
[111] https://belta.by/culture/view/jakutija-vhodjaschaja-v-top-kinoproizvoditelej-rossii-predlozhila-belarusi-sotrudnichestvo-v-etoj-sfere-664857-2024/

**Лукашэнку прэзентавалі канцэпцыю новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея і нацыянальную канцэпцыю айчыннай гісторыі, у БДУ выпусцілі падручнік па «Гісторыі Расіі і Украіны», невядомыя знішчылі крыжы і стэнды ў «віцебскіх Курапатах», гісторыка Ігара Мельнікава судзяць за «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» і тое, што ён у сваіх працах «адкрыта ўслаўляў польскіх паноў», Расія ўнесла ў папярэдні спіс ЮНЕСКА Брэсцкую крэпасць, наведвальнік Брэсцкай крэпасці паскардзіўся на гіда, што той ні разу не сказаў «Белоруссия» і «БССР», расійскія і прарасійскія актывісты чарговы раз паспрабавалі абвергнуць значнасць для беларускай гісторыі Аршанскай бітвы, прапагандысты зноў паспрачаліся пра вуліцу Каліноўскага, жыхара Мінскага раёна абвінавацілі ў «адмаўленні генацыду беларускага народа» ў «Аднакласніках», Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала выставу савецкіх плакатаў і серыю кніжных выстаў да 80-годдзя Вялікай Перамогі, моўны актывіст Ігар Случак звярнуўся ў шэраг райвыканкамаў з просьбай памяняць расійскамоўныя шыльды на беларускія, тэлеграм-чат «Беларускамоўныя» прызналі «экстрэмісцкім», Вольга Бондарава зноў змагалася з Ларысай Геніюш — навіны культуры за перыяд 1-10 верасня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 1-10 верасня 2024 года на афіцыйным сайце[112] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны дзве навіны, якія былі прысвечаны: Дню беларускага пісьменства ў Івацэвічах[113] і ўдзелу прэм'ер-міністра Беларусі Рамана Галоўчанкі і міністра культуры Анатоля Маркевіча ва ўрачыстым адкрыцці новага корпуса Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава[114]. Афіцыйны тэлеграм-канал[115] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 94 навіны. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных на тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 78 |
| Беларуская | 10 |
| Абедзве | 6 |

[112] https://www.kultura.by/

[113] https://www.kultura.by/news/xxxi-dzen-belaruskaga-pismenstva-g-ivatsevichy-na-rachystay-tsyrymonii-adkrytstsya-sabra-usikh-khto-/
[114] https://www.kultura.by/news/prem-er-ministr-raman-galo-chanka-i-ministr-kultury-anatoliy-markevich-u-dzen-veda-prynyali-dzel-va-/
[115] https://t.me/MinobrofBelarus

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 8 навін;
• культурная тэматыка — 33 навіны;
• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 7 навін;
• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 13 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***
- прыняў удзел ва ўрачыстым адкрыцці новага корпуса Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава[116].
- правёў прыём грамадзян. Былі разгледжаны пытанні, якія паступілі ад індывідуальных прадпрымальнікаў, прадстаўнікоў культуры і мастацтва. Тэматыка датычылася ўдзелу ў культурным жыцці краіны, магчымасці працаўладкавання, уключэння ў рэестр арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, прагучалі прапановы аб супрацоўніцтве ў рамках падрыхтоўкі праектаў. Падчас прыёму прайшла тэлефонная размова з Народнай артысткай Расіі Ларысай Долінай па будучых праектах і дуэце з Ганнай Трубяцкой[117].
- павіншаваў жыхароў Гродзеншчыны з 80-гадовым юбілеем Гродзенскай вобласці, уручыў падарункавы сертыфікат на набыццё піяніна «Беларусь» установе адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж»[118].
- па выніках нарады ў Лукашэнкі заявіў журналістам, што *«экспазіцыя Нацыянальнага гістарычнага музея падкрэсліць найвялікшую гісторыю Беларусі»*[119].

***Намеснік Міністра культуры Сяргей Саракач:***
- наведаў прэм’еру фільма кінастудыі «Беларусьфільм» «Культурны код» у сталічным кінатэатры «Беларусь»[120].

***Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Кацярына Усава:***
- прыняла ўдзел у агульным сходзе працоўнага калектыву Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь,

[116] https://t.me/minkultrb/41513
[117] https://t.me/minkultrb/41570
[118] https://t.me/minkultrb/41715
[119] https://t.me/minkultrb/41726
[120] https://t.me/minkultrb/41626

прысвечаным адкрыццю 92-га сезона, уручыла ўзнагароды Міністэрства культуры работнікам тэатра[121].

***Начальнік аддзела арганізацыйнай працы Міністэрства культуры Алена Быкава:***
- правяла «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях сферы культуры[122].

**Культурная тэматыка** прысутнічала ў 33 навінах. На што варта звярнуць увагу:
- шырокае асвятленне прэм'еры новай працы кінастудыі «Беларусьфільм» — прапагандысцкага фільма «Культурны код» (9 навін). Рэспубліканская прэм'ера новага фільма адбылася ў сталічным кінатэатры «Беларусь» *(«Падзея, якую мы чакалі ўсё лета»).* Падчас паказу фільма зала стоячы спявала дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь разам з героямі фільма. Фільм прэзентавалі ў Гомелі[123], Віцебску[124], Магілёве[125], Брэсце[126], Гродна[127], Барысаве[128]. У Барысаве перад паказам правялі дыялогавую пляцоўку старшыня Маладзёжнага парламента Аляксандр Тугарын і старшыня Маладзёжнага парламента пры Барысаўскім раённым Савеце дэпутатаў Дар'я Гілеўская. Яны расказалі прысутным пра важнасць дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, *«пра культурную ідэнтычнасць і ўнікальнасць народа, якія ў іх адлюстроўваюцца»*[129].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**
- у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбыўся шэраг святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня танкіста Рэспублікі Беларусь: выстава стэндавых мадэляў і ваенна-гістарычнай мініяцюры, квестбук «Зброя герояў» па экспазіцыі музея, майстар-клас «Азбука Морзэ» ад клуба «Радыёаматары». Таксама ў гэты дзень у прасторы «Музей для дзяцей» кожны жадаючы змог пазмагацца з сябрамі ў «танкавых бегах», адчуць сябе *«сапраўдным абаронцам Радзімы»* на атракцыёне віртуальнай рэальнасці «Танкавы бой»[130,131,132].
- у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася першая лекцыя з цыкла літаратурна-гістарычных мерапрыемстваў пад агульнай назвай «Францыя. Беларускі след». Цыкл прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У якасці лектара выступіў беларускі прадзюсар і рэжысёр Уладзімір Бокун. У рамках

[121] https://t.me/minkultrb/41593
[122] https://t.me/minkultrb/41685
[123] https://t.me/minkultrb/41627
[124] https://t.me/minkultrb/41643
[125] https://t.me/minkultrb/41654
[126] https://t.me/minkultrb/41666
[127] https://t.me/minkultrb/41670
[128] https://t.me/minkultrb/41645
[129] https://t.me/minkultrb/41631
[130] https://t.me/minkultrb/41599
[131] https://t.me/minkultrb/41768
[132] https://t.me/minkultrb/41718

мерапрыемства адбыўся паказ дакументальнага фільма, прысвечанага жаночаму партызанскаму атраду «Радзіма»[133].
- Мінскі гарадскі клінічны анкалагічны цэнтр далучыўся да акцыі «Партызанскі дуб», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ва ўрачыстай цырымоніі пасадкі маладога дубка на сімвалічнай алеі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту прынялі ўдзел кіраўніцтва і маладыя спецыялісты ўстановы аховы здароўя[134].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 13 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:
Расія — 10 навін;
Кітай — 1 навіна;
Малдова — 1 навіна;
В’етнам — 1 навіна.

***Расія:***
- у рамках Дзён Віцебскай вобласці ў Пскове адбыўся гала-канцэрт «З любоўю з Віцебска», падрыхтаваны творчымі сіламі Віцебскай абласной філармоніі[135].
- адной з лакацый XXXI Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах стаў кінатэатр пад адкрытым небам, дзе гледачы ўбачылі фільм «Брэсцкая крэпасць». Паказ наведалі ганаровыя госці свята, сярод якіх быў вядомы расійскі прадзюсар, кінарэжысёр і акцёр Ігар Угольнікаў. Ён падзяліўся планамі аб здымках карціны «Бацька Мінай», а таксама патлумачыў, чаму лічыць Лукашэнку *«оплотом благоденствия»*[136].
- беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» пачаў свой 55-ы юбілейны сезон выступленнем у канцэртнай зале «Кастрычніцкі» ў Санкт-Пецярбургу і даў сольны канцэрт у Зялёным тэатры ў Варонежы ў рамках фестывалю «Горад-Сад»[137].
- у рамках заключанага Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным гісторыка-культурным музеем-запаведнікам «Нясвіж» і Дзяржаўным гісторыка-мастацкім палацава-паркавым музеем-запаведнікам «Гатчына» (Расія) у Гатчынскім палацы пачала дзейнічаць фотавыстава «Нясвіж — здабытак сусветнай культуры»[138].
- у г. Вялікі Ноўгарад (Расія) у Дзяржаўным музеі мастацкай культуры Наўгародскай зямлі адбылося адкрыццё выставы жывапісу «Беларусь. Натхнёныя Радзімай», прадстаўленай Нацыянальным мастацкім музеем

[133] https://t.me/minkultrb/41694
[134] https://t.me/minkultrb/41706
[135] https://t.me/minkultrb/41480
[136] https://t.me/minkultrb/41501
[137] https://t.me/minkultrb/41755
[138] https://t.me/minkultrb/41578

Рэспубліку Беларусь. Выстава праходзіць у рамках праекта «Садружнасць праз мастацтва»[139].
- ансамбль танца, музыкі і песні «Талака» Віцебскай абласной філармоніі прадставіў праграму «Услед за сонцам» на Дні беларускага пісьменства ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Маскве[140].
- у Стаўрапалі (Расія) прайшоў XXXI Міжнародны фестываль-конкурс ваенна-патрыятычнай песні «Салдацкі канверт». У падрыхтоўцы канцэрта была задзейнічана пастановачная група Цэнтра культуры «Віцебск» на чале з рэжысёрам праектаў «Славянскага базару ў Віцебску» Ірынай Каўленай[141]. Гран-Пры фестывалю-конкурсу заваяваў беларус Яўген Курчыч. Ён выканаў песню «Пакінуць след» кампазітара Яўгена Алейніка на вершы нявесткі Лукашэнкі Ганны Селук[142].
- арт-група «Магілёўцы» (Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай працы) прыняў удзел у мерапрыемствах VII Міжнароднага форуму «Культурная спадчына старажытных гарадоў». Калектыў выканаў патрыятычныя кампазіцыі, песні ваенных гадоў, вядомыя беларускія песні ў аўтарскай апрацоўцы, шлягеры 80-х і 90-х гадоў, а таксама сучасныя кампазіцыі[143].

***Кітай:***
- у Нацыянальным мастацкім музеі Кітая адкрылася выстава сучаснага беларускага мастацтва «Шаўковы шлях аб'ядноўвае сэрцы»[144].

***Малдова:***
- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі «Малдаване Беларусі: этнакультурная ідэнтычнасць і інтэграцыя». У мерапрыемстве прыняла ўдзел аўтар кнігі, доктар гістарычных навук, дацэнт Лізавета Квілінкова, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Рэспубліцы Беларусь 2017-2021 гг, старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Малдова» Віктар Сарачан, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Аляксандр Румак і іншыя[145].

***В'етнам:***
- Мірскі замак наведала высокапастаўленая дэлегацыя на чале з членам ЦК КПВ, Міністрам грамадскай бяспекі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам генералам-палкоўнікам Лыонг Там Куанга[146].

---
[139] https://t.me/minkultrb/41592
[140] https://t.me/minkultrb/41619
[141] https://t.me/minkultrb/41638
[142] https://t.me/minkultrb/41740
[143] https://t.me/minkultrb/41734
[144] https://t.me/minkultrb/41678
[145] https://t.me/minkultrb/41719
[146] https://t.me/minkultrb/41767

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 1 па 10 верасня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

- **Урачыстае мерапрыемства, прысвечанае адкрыццю Сярэдняй школы №24 імя К. М. Сіманава** *(Магілёў)*. Новай школе ў Беларусі прысвоена імя савецкага драматурга Канстанціна Сіманава. Супрацоўнікі прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь прынялі ўдзел у мерапрыемстве і перадалі ў фонд бібліятэкі серыю выданняў мастацкай літаратуры[147].
- **Майстар-клас па мезенскім роспісе** *(Мінск)*. Творчая майстэрня Рускага Дома ў Мінску зноў адчыніла дзверы для школьнікаў, каб расказаць пра рускі народны промысел[148].
- **Усесаюзны паэтычны конкурс «Душы цудоўныя парывы».** Конкурс праходзіць пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску. Геаграфія конкурсу ахоплівае Расійскую Федэрацыю і Рэспубліку Беларусь. Старшыня журы — Народны артыст Расіі Сяргей Бязрукаў[149].
- **Памятныя мерапрыемствы да 83-й гадавіны пачатку блакады Ленінграда** *(Мінск)*. Члены грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі саюз блакаднікаў Ленінграда» і «Непаўналетнія ахвяры блакаднага Ленінграда», расійскія дыпламаты і прадстаўнікі Рассупрацоўніцтва, актывісты арганізацый расійскіх суайчыннікаў, курсанты, кадэты, суворaўцы ў рамках гарадской акцыі « Ніхто не забыты, нішто не забыта» ўшанавалі памяць ахвяр нацысцкай агрэсіі і ўсклалі кветкі да манумента ля Вечнага агню на плошчы Перамогі ў Мінску[150].
- **Святочны мітынг да Дня Ваенна-паветраных сіл Беларусі і 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў** *(пасёлак Зяброўка)*. Урачыстая частка мерапрыемства — ускладанне кветак да помніка лётчыкам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў мірны час[151].

[147] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14686
[148] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14712
[149] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14742
[150] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14751
[151] https://t.me/russiangomel/4732

- **Наведванне дзіцячага сада №111** *(Гомель)*. У рамках віншавальнай праграмы да новага навучальнага года прадстаўнікі Рускага Дома ў Гомелі перадалі ў дар кнігі для дашкалят[152].

- **Прэзентацыя новага выпуску літаратурна-мастацкага часопіса «Метамарфозы»** *(офіс Рускага Дома ў Гомелі)*. Важным элементам вечарыны стала ўсерасійская акцыя «Усмешка Гагарына», ініцыятарам якой з'яўляецца Усерасійскі грамадскі рух «Валанцёры Перамогі». Усё, што трэба было зрабіць, — фота з партрэтам першага касманаўта[153].

- **Сустрэча з рэжысёрам Дзмітрыем Нячаевым** *(офіс Рускага Дома ў Гомелі)*. Пры падтрымцы Рускага Дома Нячаеў прыняў удзел у Міжнародным кінафестывалі «КінаКот» з фільмам каманды Цэнтра Інклюзіўнай Культуры Гомеля «Дзеці вайны»[154].

- **Адкрыццё размоўнага клуба «Рускі як замежны»** *(офіс Рускага Дома ў Гомелі)*. Клуб будзе дзейнічаць для замежных студэнтаў, якія жывуць у Беларусі. Рабят сустрэлі ў рускіх народных строях з караваем і народнымі песнямі. З прывітальным словам выступіла кіраўнік Рускага Дома ў Гомелі Вольга Бараненка[155].

- **Праваслаўны фестываль «Радасць»** *(Брэст)*. Выступаючы перад удзельнікамі фестывалю, генеральны консул Расіі ў Брэсце А. Мурашаў адзначыў вялікую стваральную дзейнасць Рускай праваслаўнай царквы, накіраваную на захаванне *«гістарычнай, культурнай, духоўнай спадчыны, умацаванне інстытута сям'і»*[156].

- **Рабочая паездка ў Пінск генеральнага консула Расіі ў Брэсце А. Мурашава.** У ходзе размовы са старшынёй Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў Куніцкім былі абмеркаваны пытанні эканамічнага і культурна-гуманітарнага ўзаемадзеяння расійскіх рэгіёнаў з Пінскам. Выступаючы перад школьнікамі, Мурашаў запрасіў іх да ўдзелу ў міжнародных конкурсах, прысвечаных Саюзнай дзяржаве і 80-годдзю Вялікай Перамогі[157].

- **Праект «Малюем гісторыю: 80 гадоў Перамогі»** *(Брэст)*. Да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне Рускі Дом у Брэсце аб'явіў конкурс дзіцячага малюнка для навучэнцаў мастацкіх студый Брэста і Брэсцкай вобласці. Лаўрэатаў чакаюць не толькі дыпломы і падарункі, але і магчымасць удзелу ў культурна-адукацыйных паездках у Расію па праграме Рассупрацоўніцтва. Лепшыя работы на тэму Вялікай Перамогі будуць апублікаваны ў юбілейным календары расійскага цэнтра на 2025 год[158].

---

[152] https://t.me/russiangomel/4764
[153] https://t.me/russiangomel/4769
[154] https://t.me/russiangomel/4780
[155] https://t.me/russiangomel/4826
[156] https://t.me/RusConsBrest/3680
[157] https://t.me/RusConsBrest/3700
[158] https://t.me/rcnkbrest/24073

**Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 1-10 верасня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці**

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**Лукашэнку прэзентавалі канцэпцыю новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея.**

Нагадаем, што аб будаўніцтве новага гістарычнага музея Аляксандр Лукашэнка заявіў яшчэ ў чэрвені на сустрэчы з сакратаром партыйнага камітэта Пекінскага ўніверсітэта Хаа Пінам і прадстаўнікамі кітайскіх універсітэтаў. Тады ён паведаміў, што прапануе Кітаю пабудаваць у Мінску яшчэ адзін знакавы праект, якім і можа стаць гістарычны музей[159]. У пачатку верасня Лукашэнка сабраў нараду па пытаннях архітэктурнага рашэння і канцэпцыі экспазіцыі культурна-гістарычнага комплексу «Нацыянальны гістарычны музей»[160]. Варта звярнуць увагу на некаторыя яго выказванні з гэтай нагоды: *«Мы вызначыліся з падыходамі да гісторыі беларускай дзяржаўнасці, у цэлым — дзяржаўнай палітыкі ў сферы гісторыі. Перасталі “саромецца” некаторых перыядаў нашай гісторыі. Асноўная мэта — паказаць няпросты тысячагадовы шлях беларусаў да набыцця дзяржаўнасці»[161]; «У змесце экспазіцыі не павінна быць ніякага нацыяналістычнага або ўра-патрыятычнага перахлёсту. У ёй трэба адлюстраваць аб’ектыўны погляд на нашу гісторыю, каб не толькі беларусы, але і іншыя народы маглі пагадзіцца з яе трактоўкай ці, ва ўсякім разе, не маглі адхіліць або адмаўляць яе»[162]*. Цікава, што, па інфармацыі, якую апублічыў у сваім тэлеграм-канале генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, Аляксандр Лукашэнка зараз чытае кнігу па рускай гісторыі — курс лекцый Васіля Ключэўскага[163].

***

**Лукашэнку прэзентавалі нацыянальную канцэпцыю айчыннай гісторыі.**

Гісторыкамі распрацавана нацыянальная канцэпцыя айчыннай гісторыі на аснове ідэалогіі беларускай дзяржавы. Пра гэта журналістам заявіў

[159] https://reformby.org/lukashenko-sobiraetsja-stroit-novyj-istoricheskij-muzej-na-meste-drimljenda
[160] https://nashaniva.com/350771
[161] https://t.me/minkultrb/41675
[162] https://t.me/minkultrb/41676
[163] https://t.me/Gigin_Vadim/1814

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Вячаслаў Даніловіч. *«Сіла нашай нацыянальнай канцэпцыі айчыннай гісторыі ў тым, што мы не выкраслілі ніводны гістарычны перыяд»,* — заявіў дэпутат і пералічыў усе гэтыя перыяды, што праўда, забыўшыся на перыяд Рэчы Паспалітай, і назваўшы адным з ключавых этапаў савецкі. Па яго словах, *«гэта была складаная эпоха, але менавіта ў савецкі перыяд была закладзена наймагутнейшая грамадска-палітычная, сацыяльна-эканамічная і духоўна-культурная база для сучаснай Рэспублікі Беларусь»*[164].

***

**У БДУ выпусцілі падручнік па «Гісторыі Расіі і Украіны».**
Нібыта па перыядзе з 1905 да нашых часоў, але апошняе, пра што распавядаюць аўтары — выбары Барыса Ельцына. Што яшчэ цікавага ў новым дапаможніку для студэнтаў-гісторыкаў? Беларусь там часта называюць «Беларусія». Пра антыбальшавіцкі супраціў ва Украіне няма ані слова. Як і пра гісторыю краіны пасля абвяшчэння незалежнасці[165].

***

**Невядомыя знішчылі крыжы і стэнды ў «віцебскіх Курапатах» — недалёка ад вёскі Хайсы ў Віцебскім раёне.**
Пра гэта распавёў стваральнік ініцыятывы «Хайсы — віцебскія Курапаты» Ян Дзяржаўцаў. Паводле яго слоў, знішчаны ўсе 8 металічных паказальнікаў, якія вялі да магіл ахвяр камуністычнага тэрору. Акрамя таго, знішчаны 26 крыжоў разам з таблічкамі, якія расказвалі пра расстрэлы ў часе сталінскага тэрору. Дзяржаўцаў адзначае, што металічныя рамкі ад стэндаў і таблічак пры гэтым засталіся цэлымі, а самі стэнды з пластыка разбіты і зніклі[166].

***

**Гісторыка Ігара Мельнікава судзяць за «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» і тое, што ён у сваіх працах «адкрыта ўслаўляў польскіх паноў».**
Судовы працэс над гісторыкам пачаўся ў Мінгарсудзе. Ігару Мельнікаву закідаюць «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці». Фармальна Мельнікава судзяць за інтэрв'ю незалежнаму СМІ, якое ён даў у 2022 годзе. Газета адміністрацыі Лукашэнкі выставіла і свае абвінавачванні на адрас Мельнікава. У рэпартажы гаворыцца, што ён *«у сваіх так званых працах адкрыта ўслаўляў польскіх паноў, якія гадамі прыгняталі беларускі народ, выказваў асаблівую любоў да баевікоў з Арміі Краёвай»*[167].

---

[164] https://nashaniva.com/350795
[165] https://t.me/euroradio/56743
[166] https://nashaniva.com/350886
[167] https://nashaniva.com/351041

Нагадаем, што яшчэ ў жніўні суд у Мінску прызнаў «экстрэмісцкімі» кнігі Мельнікава, а сам ён больш за паўгода знаходзіцца ў зняволенні[168].

***

**Расія ўнесла ў папярэдні спіс ЮНЕСКА Брэсцкую крэпасць.**
Заяўка для будучай расійска-беларускай транснацыянальнай намінацыі «Мемарыялы героям Вялікай Айчыннай вайны: Брэсцкая крэпасць і Мамаеў курган» была падрыхтаваная калектывам аддзела сусветнай спадчыны і міжнароднага супрацоўніцтва Расійскага навукова-даследчага інстытута культурнай і прыроднай спадчыны імя Д. С. Ліхачова пад кіраўніцтвам Надзеі Філатавай. Заяўка прэзентуе два маштабныя мемарыяльныя комплексы, звязаныя з пачаткам і пераломным момантам баявых дзеянняў на Усходзе, як *«грандыёзныя творы чалавецтва, якія фарміруюць новую мастацкую мову, і як унікальныя сведчанні, заклікаными ўвекавечыць подзвіг савецкага народа-пераможца і ўшанаваць памяць абаронцаў Айчыны, якія загінулі ў самым кровапралітным канфлікце XX стагоддзя»*[169].

***

**Наведвальнік Брэсцкай крэпасці паскардзіўся на гіда. Прэтэнзія ў тым, што экскурсавод ні разу не сказаў «Белоруссия» і «БССР».**
Больш за тое, наведвальніка абурыла, што ў адказ на пытанне *«з якой прычыны салдаты самааддана ішлі на верную гібель і да апошняга змагаліся»* гід адказаў, што яны не мелі выбару і баяліся рэпрэсій. Нязгодны напісаў на гіда кляўзу ў Мінкульт з патрабаваннем растлумачыць, *«з якой нагоды гід дзяржустановы распаўсюджвае сярод беларускіх і замежных турыстаў хлусню пра савецкую армію»* і звольніць яго[170]. Адтуль прыйшоў адказ, што з гідам правялі тлумачальную гутарку[171]. Прарасійскую актывістку Вольгу Бондараву здзівіла, што *«гіда не пакаралі, не адхлесталі мокрымі анучамі па мардасах, не пазбавілі ліцэнзіі, а ўсяго толькі “правялі тлумачальную гутарку”»*[172].

***

**Расійскія і прарасійскія актывісты чарговы раз паспрабавалі абвергнуць значнасць для беларускай гісторыі Аршанскай бітвы 1514 года.**
Штогод 8 верасня беларусы адзначаюць нацыянальнае свята — Дзень беларускай вайсковай славы — вялікай перамогі над намнога большым войскам маскоўскіх захопнікаў, здабытай у абарончай вайне, на сваіх землях і сваёй жа арміяй, кіраванай сваім гетманам. Аднак расійскія і

[168] https://news.zerkalo.io/life/77100.html?c
[169] https://nashaniva.com/351017
[170] https://t.me/euroradio/56661
[171] https://news.zerkalo.io/life/77385.html?tg=3
[172] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/34099

прарасійскія актывісты спрабуюць абвергнуць значнасць гэтай падзеі для беларускай гісторыі. Сярод іх расійскі гісторык, дырэктар фонду «Гістарычная памяць» Аляксандр Дзюкаў[173]. А генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін зрабіў такую выснову: *«Аршанская бітва ўжо даўно стала часткай “ліцвінскай легенды”, да крайнасці русафобскай у сваёй аснове. Па гэтай канцэпцыі ўся гісторыя Беларусі паўстае як нейкае тытанічнае супрацьстаянне з Расіяй»*[174].

***

**Лукашэнкаўскія прапагандысты зноў паспрачаліся, ці варта, каб вуліца ў Мінску насіла імя нацыянальнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага.**

Аляксандр Шпакоўскі заявіў: *«Наогул перайменаванне вуліц — пытанне вельмі спрэчнае і папахвае практыкамі палітычнага ўкраінства, у якім няма роўным лікам нічога добрага. Гістарычны міф аб Каліноўскім — канструкт сталінскай эпохі. А тады прапрацоўка ідэалагічнага складніка дзяржаўнай палітыкі была на найвышэйшым узроўні»*[175]. Аляксей Дзермант нагадаў, што за савецкім часам фігуру Каліноўскага выкарыстоўвалі як сімвал класавай барацьбы, а падчас вайны яго імем быў названы партызанскі атрад, і прапанаваў назву вуліцы скарэктаваць — назваць імем гэтага партызанскага атрада[176]. Самым катэгарычным у спрэчцы аказаўся Рыгор Азаронак: *«Каліноўскі — ключавая фігура ў русафобскім гістарычным міфе. У ім няма нічога, акрамя “толькі тады народзе зажывеш, калі маскаля над табой не будзе”. Ён трывала ўпісаны ў польска-літоўскую канцэпцыю міжмор’я. Ён прапануе беларусам толькі кроў, толькі вайну, толькі русафобію. Яго не ўманціраваць, не ўклініць ніяк у нашу дзяржаўнасць»*[177]. Пры гэтым усе апаненты аднагалосна пагадзіліся, што ў Мінску не патрэбна вуліца імя Ежы Гедройца.

***

**Жыхара Мінскага раёна абвінавачваюць у «адмаўленні генацыду беларускага народа» ў «Аднакласніках».**

Згодна версіі абвінавачвання, з кастрычніка 2020 года па лістапад 2023 года мужчына адміністраваў у «Аднакласніках» адкрытую групу. Там ён размясціў некалькі публікацый з *«негатыўнай ацэнкай Лукашэнкі»*, а таксама публікацыю, у якой *«адмаўляў масавае знішчэнне вайскоўцамі 118-га шуцманшафт-батальёна ахоўнай паліцыі і асаблівага батальёна СС Дырлевангера мірных жыхароў вёскі Хатынь у выніку карнай аперацыі 22 сакавіка 1943 года»*[178].

---

[173] https://t.me/historiographe/15117
[174] https://t.me/Gigin_Vadim/1830
[175] https://t.me/shpakouski/5138
[176] https://t.me/dzermant/8707
[177] https://t.me/AzarenokCTV/35941
[178] https://t.me/viasna96/27597

***

**Беларусь і Калужская вобласць падпісалі новы план сумесных мерапрыемстваў на 2024-2026 гады.**

Новы план уключае ў сябе супрацоўніцтва ў галіне прамысловасці, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, турызму, культуры, навукі, адукацыі[179].

***

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала выставу савецкіх плакатаў, прымеркаваную да Дня ведаў.**

*«Яркія вобразы савецкага мінулага нашай Радзімы цёпла адклікаюцца ў сэрцы кожнага дарослага беларуса, а ў дзяцей выклікаюць жывую, непадробную цікавасць»*[180].

***

**Для наведвання ідэалагічнага фільма «Культурны код» у Гродне ўключылі адмінрэсурс.**

Па стане на вечар 4 верасня ў кінатэатрах Гродна на прэм’еру фільма «Культурны код» не прадалі ніводнага квітка. Яго дэманструюць у кінатэатрах «Космас», «Чырвоная зорка» і «Кастрычнік». А ў дзень прэм’еры раптам выкупілі адразу тры шэрагі месцаў[181].

***

**Улады змянілі правілы арганізацыі і правядзення кінафестывалю «Лістапад». Сярод крытэрыяў адбору — «духоўныя і маральныя» фільмы.**

Адпаведную пастанову № 656 прыняў Савет Міністраў 6 верасня. Ацэньвацца будуць актуальнасць і арыгінальнасць тэмы і сюжэту кінакарціны, пераканаўчасць і лагічнасць іх раскрыцця ў сцэнарыю і дыялогах персанажаў, а таксама ўвасабленне духоўных і маральных каштоўнасцей, гуманістычных эстэтычных ідэалаў[182].

***

**Моўны актывіст Ігар Случак звяртаўся ў шэраг райвыканкамаў з просьбай памяняць расійскамоўныя шыльды з назвамі вуліц і іншых геаграфічных аб’ектаў на беларускія і атрымаў некалькі адказаў. Сярод іх — як станоўчыя, так і адмоўныя.**

У Нясвіжскім райвыканкаме адказалі, што цяпер у цэнтральнай частцы Нясвіжа *«для зручнасці турыстаў і гасцей горада»* ёсць указальнікі з

179 https://t.me/ontnews/157992
180 https://t.me/libraryofbel/4231
181 https://t.me/holybelawood/4781
182 https://t.me/holybelawood/4792

найменнямі вуліц па-расійску, якія абнавілі ў 2023 годзе, таму *«няма неабходнасці і дадатковых фінансавых сродкаў для замены іх»*. Немэтазгоднай замену ўказальнікаў палічылі ўлады Лунінца, Мсціслава *(«раён мае шматгадовую гісторыю супрацоўніцтва з прымежнымі раёнамі Смаленскай вобласці РФ»)*, Вілейкі, Лагойска. Разам з тым, актывіст атрымаў і некалькі станоўчых адказаў. У Ваўкавыску, Мядзеле, Шклове і Пастаўскім раёне яму паабяцалі, што ўсе новыя вулічныя шыльды будуць толькі на беларускай мове. Таксама знакі на беларускай мове пачалі ставіць на мясцовых дарогах Бабруйскага раёна[183].

***

**Тэлеграм-чат «Беларускамоўныя» прызналі «экстрэмісцкім».**
Гэта вынікае з абноўленага спісу на сайце Мінінфарма. У чаце 170 чалавек. Правіламі пабліка забараняецца размаўляць на якой-небудзь іншай мове, акрамя беларускай[184].

***

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі адкрыла серыю кніжных выстаў да 80-годдзя Вялікай Перамогі, у рамках праекта «Пастараемся ж і мы быць дастойнымі іх Вялікай Перамогі!» ва ўстановах адукацыі.**
Першая кніжная выстава «Застацца чалавекам у полымі вайны» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа 62 г. Мінска»[185]. Другая кніжная выстава «Памяць — гісторыі, гонар — подзвігу, вернасць — дзяржаве» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа 24 г. Мінска»[186]. Трэцяя кніжная выстава «Салют вам, салдаты Перамогі!» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа 97 г. Мінска»[187]. Чацвёртая кніжная выстава «Генацыд беларускага народа» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа № 121 г. Мінска»[188]. Пятая кніжная выстава «Піянеры-героі» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа № 114 г. Мінска»[189]. Шостая кніжная выстава «Абаронцы цытадэлі над Бугам» адкрылася ў ДУА «Сярэдняя школа № 30 г. Мінска»[190].

***

**Прарасійская актывістка Вольга Бондарава абурылася, што па тэлеканале ТВ 3 паказалі фільм пра Ларысу Геніюш.**
Актывістка падрыхтавала зварот у Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, а на сваёй тэлеграм-старонцы напісала: *«Па канале ТБ 3, які ўключаны ва ўсе пакеты "Белтэлекама", быў паказаны пранізлівы фільм беларускай вытворчасці "Птушкі без гнёзд" (1996) рэжысёра В. Дудзіна*

[183] https://www.svaboda.org/a/33110816.html
[184] https://t.me/viasna96/27530
[185] https://t.me/libraryofbel/4219
[186] https://t.me/libraryofbel/4226
[187] https://t.me/libraryofbel/4236
[188] https://t.me/libraryofbel/4243
[189] https://t.me/libraryofbel/4257
[190] https://t.me/libraryofbel/4264

*пра памагатую нацыстаў Ларысу Геніюш, пра яе барацьбу за нашу і вашу і з крывавым НКУС»*[191,192]. Пазней Бондарава выказала незадаволенасць тым, што на афіцыйным сайце Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі на старонцы, прысвечанай беларускай паэтцы Геніюш *«толькі дыфірамбы ў гонар нацысцкай подсцілкі. І ні слова пра тое, што жывёліна данаціла на войска Гітлера, каб той спальваў беларускі народ у крэматорыях»*[193].

[191] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/34025
[192] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/34046
[193] https://t.me/bondareva_bez_kupjur/34052

**Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр гістарычнай памяці пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы захавання гістарычнай памяці, процідзеяння скажэнню гістарычнай праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны і генацыдзе савецкага народа, дэлегацыя фонду «Мой радавод» Расійскай Федэрацыі і ўнучаты пляменнік Фелікса Дзяржынскага з рабочым візітам наведалі Ліцэй ім. Ф. Э. Дзяржынскага БДУ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін выказаўся пра «шкоднасць міфа аб Каліноўскім» і назваў палітыку Рэчы Паспалітай этнацыдам беларускага народа, гісторыка Ігара Мельнікава прысудзілі да 4 гадоў калоніі, ва Уфе прайшоў XVII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі СНД, а ў Мінску — Дні Екацярынбурга, у Магілёве адкрылі праспект «17-га верасня», Гомельская пракуратура запатрабавала ад «Яндекс Музыки» выдаліць песні рагачоўскага гурта Tor Band, амерыканскае агенцтва Associated Press апублікавала артыкул пра тое, як у Беларусі знікае родная мова, а расійская займае першыя ролі, «Беларусьфільм» прадставіў трэйлер экранізацыі рамана Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі» і разам з «Татаркіно» плануе зняць фільм пра вайну ва Украіне — навіны культуры за перыяд 11-20 верасня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 11-20 верасня 2024 года на афіцыйным сайце[194] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 2 навіны, якія былі прысвечаны: анонсу «прамой тэлефоннай лініі» з удзелам міністра культуры Беларусі Анатоля Маркевіча[195] і сустрэчы Анатоля Маркевіча з беларусамі замежжа[196]. Афіцыйны тэлеграм-канал[197] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 113 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных на тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| Мова паведамленняў | колькасць навін |
|---|---|
| Руская | 75 |
| Беларуская | 34 |

[194] https://www.kultura.by/

[195] https://www.kultura.by/news/yests-pytanni-telefanuytse/
[196] https://www.kultura.by/news/ministr-kultury-anatoliy-markevich-belorusam-zarubezhya-nevazhno-svetit-li-vam-yuzhnoe-solntse-treshch/
[197] https://t.me/MinobrofBelarus

| | |
|---|---|
| Абедзве | 4 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 21 навіна;
• культурная тэматыка — 25 навін;
• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 8 навін;
• святкаванне Дня народнага адзінства — 18 навін;
• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 31 навіна.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***
- накіраваў словы прывітання гасцям і ўдзельнікам XXVIII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая Вежа»[198,199].
- прыняў удзел у X Санкт-Пецярбургскім міжнародным форуме аб'яднаных культур[200,201], дзе:
  - наведаў дзяржаўны гісторыка-мемарыяльны музей «Смольны»[202];
  - абмяркоўваў культурнае супрацоўніцтва з афіцыйнымі прадстаўнікамі розных краін: Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, Туркменістана, Казахстана, Азербайджана[203];
  - сустрэўся з намеснікам Міністра спорту, мастацтва і культуры Рэспублікі Зімбабвэ[204], прэзідэнтам Дзелавога савета БРІКС Вісэнтэ Барыентасам[205], Дарадцам Прэзідэнта Рэспублікі Нікарагуа па пытаннях культуры Луісам Энрыке Маралесам Алонса, Дарадцам Пасольства Рэспублікі Куба ў РФ Маркасам Феліксам Ласа Вільтрэсам[206], Міністрам культуры Арабскай Рэспублікі Егіпет Ахмеда Фуада Хано[207];
  - наведаў III Міжнародны фестываль цыркавога мастацтва «Без меж»[208];
  - з прывітальным словам выступіў на цырымоніі адкрыцця выставы «Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў» (сумесны праект Дзяржаўнага Рускага музея і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь)[209];

198 https://t.me/minkultrb/41803
199 https://t.me/minkultrb/41812
200 https://t.me/minkultrb/41819
201 https://t.me/minkultrb/41906
202 https://t.me/minkultrb/41856
203 https://t.me/minkultrb/41909
204 https://t.me/minkultrb/41921
205 https://t.me/minkultrb/41924
206 https://t.me/minkultrb/41925
207 https://t.me/minkultrb/41936
208 https://t.me/minkultrb/41951
209 https://t.me/minkultrb/41955

- выступіў на пасяджэнні XXXIX Савета па культурным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД[210].

- прыняў удзел у дыялогавай пляцоўцы з беларусамі замежжа ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны[211], уручыў узнагароды прадстаўнікам замежных самадзейных творчых калектываў і грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа[212]. *«У цяперашнім свеце Беларусь застаецца духоўнай крэпасцю, абараняе традыцыйныя каштоўнасці, веру і культуру,* — сказаў Анатоль Маркевіч падчас сустрэчы з кіраўнікамі творчых калектываў беларусаў замежжа. — *На працягу стагоддзяў калектыўны Захад і ЗША ўяўлялі сябе сэрцам цывілізацыі, носьбітамі дэмакратычных ідэалаў і перадавой культуры (ў іх разуменні). І вельмі доўга гэты механізм спрацоўваў. Але сёння сітуацыя кардынальна змянілася. Так званы калектыўны Захад скочваецца ў прорву духоўнай дэградацыі. "Такая культура нам не патрэбная!", — заяўляюць мільярды людзей. І з надзеяй глядзяць на славянскі свет, чакаючы выратавання ад разгулу сатанінскіх сіл»*[213,214,215].

***Першы намеснік Міністра культуры Валерый Грамада:***

- выступіў з прывітальным словам і ўручыў узнагароды пераможцам XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры» (ў рамках навукова-метадычнай канферэнцыі «Сучасны стан публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь»)[216].
- прыняў удзел у навучальным семінары-практыкуме для ідэалагічнага актыву Рэспублікі Беларусь[217].

***Начальнік управлення капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Міністэрства культуры Аляксандр Бартошык:***

- правёў «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях будаўніцтва ў сферы культуры[218].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у Крычаве адбылася патрыятычная акцыя «Вахта памяці па месцах баёў 8-й Чырвонапрэсненскай дывізіі». Удзел у акцыі прынялі творчыя калектывы Расійскай акадэміі музыкі ім. Гнесіных, Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі ім. Чайкоўскага, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры БДАМ. Мерапрыемства прымеркавана да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх

[210] https://t.me/minkultrb/41962
[211] https://t.me/minkultrb/42195
[212] https://t.me/minkultrb/42199
[213] https://t.me/minkultrb/42211
[214] https://t.me/minkultrb/42217
[215] https://t.me/minkultrb/42218
[216] https://t.me/minkultrb/41918
[217] https://t.me/minkultrb/42208
[218] https://t.me/minkultrb/41869

захопнікаў, 25-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне[219].
- каля Полацкай дзіцячай паліклінікі быў адкрыты памятны знак у гонар гераізму, праяўленага ў гады Вялікай Айчыннай вайны па выратаванні выхаванцаў Полацкага дзіцячага дома[220].
- стала вядома, што 1 кастрычніка Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» прадставіць у Магілёве тэатралізаваную праграму «Памяць сэрца» — харэаграфічны спектакль, у якім гучыць тэма трагічнага лёсу жанчыны падчас вайны[221].
- у Вялікай Бераставіцы была прадстаўлена мабільная экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Наш абавязак — памятаць». Экспазіцыя створана на аснове фондавых матэрыялаў музея ў гонар святкавання 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[222].

**Святкаванне Дня народнага адзінства:**
- у Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя Масленікава пачала работу выстава «У адзінстве народа — сіла краіны»[223].
- у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося адкрыццё выставы дзіцячых і юнацкіх работ па выніках Рэспубліканскага конкурсу выяўленчага мастацтва «Вобраз Радзімы любімай», арганізаванага Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Творчае мерапрыемства прымеркавана да свята Дня народнага адзінства і 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[224].
- у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь прайшоў рэспубліканскі навукова-практычны семінар. Супрацоўнікі музеяў падзяліліся вопытам па пытаннях музейнага паказу на тэму 85-годдзя вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Таксама госці семінара наведалі экспазіцыю «Беларусь непераможная» і новую экспазіцыю Музея гісторыі беларускага кіно[225].
- Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь прадставіў выставу адной карціны — твора Маноса Ісакавіча Манасзона «Сустрэча савецкіх танкістаў у Заходняй Беларусі»[226].
- у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылося чытанне лекцыі «Мы разам назаўжды: да 85-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР» кандыдата гістарычных навук, дацэнта гістарычнага факультэта БДУ Кузьмы Козака[227].

[219] https://t.me/minkultrb/41992
[220] https://t.me/minkultrb/42067
[221] https://t.me/minkultrb/42187
[222] https://t.me/minkultrb/42194
[223] https://t.me/minkultrb/41810
[224] https://t.me/minkultrb/41823
[225] https://t.me/minkultrb/41838
[226] https://t.me/minkultrb/42006
[227] https://t.me/minkultrb/42033

- у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачаў работу выставачны праект, прымеркаваны да 85-годдзя ўз'яднання беларускага народа[228].
- у Музеі гісторыі беларускага кіно для наведвальнікаў прагучала тэматычная лекцыя «Сяргей Прытыцкі і "Чырвонае лісце"»[229].
- у Бешанковічах у Дзень народнага адзінства пасля рэканструкцыі адкрылі Раённы цэнтр культуры і Алею Славы[230].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** была прысвечана 31 навіна, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:
Расія — 25 навін;
Кітай — 1 навіна;
Зімбабвэ — 1 навіна;
Нікарагуа —1 навіна;
Куба — 1 навіна;
Егіпет — 1 навіна;
БРІКС — 1 навіна.

***Расія:***
- у Смаленску прайшоў XVII фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», у якім узяла ўдзел і беларуская дэлегацыя[231,232,233,234].
- дэлегацыя Беларусі на чале з міністрам культуры Анатолем Маркевічам прыняла ўдзел у X Санкт-Пецярбургскім міжнародным форуме аб'яднаных культур. Асноўная тэма форуму — «Культура XXI стагоддзя: суверэнітэт ці глабалізм?»[235]. Варта звярнуць увагу на такія падзеі, якія адбыліся ў межах форуму:
    - Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава выступіла з дакладам у панэльнай дыскусіі на тэму «Краіны СНД — шляхі збліжэння». Яна расказала аб сумесных з Расійскай Федэрацыяй і іншымі краінамі СНД творчых праектах тэатра і выступіла з прапановай арганізаваць міжнародны фестываль музычных тэатраў краін СНД, абапіраючыся на вопыт правядзення на базе Вялікага тэатра Беларусі ўсесаюзных конкурсаў і фестываляў у 1970-80-я гг. Спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве, сустаршыня Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД Міхаіл Швыдкой падтрымаў гэту прапанову і выказаў гатоўнасць пачаць работу ў гэтым напрамку[236].

[228] https://t.me/minkultrb/42037
[229] https://t.me/minkultrb/42053
[230] https://t.me/minkultrb/42087
[231] https://t.me/minkultrb/41793
[232] https://t.me/minkultrb/41822
[233] https://t.me/minkultrb/41864
[234] https://t.me/minkultrb/41929
[235] https://t.me/minkultrb/41819
[236] https://t.me/minkultrb/41914

- Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава і мастацкі кіраўнік, выконваючы абавязкі дырэктара Чувашскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета «Волга Опера» Андрэй Папоў падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве, які прадугледжвае арганізацыю гастрольнай дзейнасці двух калектываў, абмен салістамі і выканальніцкімі калектывамі, ажыццяўленне сумесных пастановак, правядзенне майстар-класаў і іншыя формы творчага ўзаемадзеяння. Першай ластаўкай гэтага супрацоўніцтва стане ўдзел калектыву «Волга Оперы» ў Мінскім міжнародным Калядным оперным форуме. У снежні тэатр з Чабаксар прадставіць у Мінску лічбавую касмічную оперу Р. Сагдзіева «Галоўнае пытанне»[237].
- Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча выступіў на Саборнай плошчы Петрапаўлаўскай крэпасці ў рамках фестывалю «Сярэбраныя каралі» падчас Дзён народнай культуры Паўночна-Заходняга рэгіёну[238].
- Дзяржаўны Рускі музей сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь урачыста адкрылі выставу «Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў». На цырымоніі з прывітальным словам выступілі Міністр культуры РФ Вольга Любімава, Міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч і губернатар Санкт-Пецярбурга Аляксандр Бяглоў[239]. Выстава акцэнтуе ўвагу на *«глыбокіх культурных беларуска-расійскіх сувязях, падкрэслівае значнасць гістарычных узаемадзеянняў, якія ўзбагачаюць культуры брацкіх народаў»*. Генеральны дырэктар Рускага музея Ала Манілава: *«Ідэя экспазіцыі з'явілася невыпадкова: нашыя дзяржавы аб'ядноўвае агульны культурны код. Выстаўка стане бачным пацвярджэннем традыцыйных духоўных сувязей Расіі і Беларусі»*[240].

- стала вядома, што 22 кастрычніка на сцэне Палаца культуры г. Маладзечна выступяць артысты Рускага Нацыянальнага класічнага балета пад кіраўніцтвам Ганны Нехлюдавай са спектаклем «Эсмеральда». У пастаноўцы прымуць удзел артысты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі і Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра ім. Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі[241].
- у Музеі Янкі Купалы ў с. Пячышчы (Рэспубліка Татарстан) адбылося адкрыццё часовай экспазіцыі «Якуб Колас і Янка Купала: зямля і неба беларускай літаратуры». У мерапрыемстве прынялі ўдзел: кіраўнік Аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у РФ у г. Казані саветнік Віктар Шчэцько, прадстаўнікі беларускай дыяспары, музейшчыкі, настаўнікі, літаратары і перакладчыкі[242].

[237] https://t.me/minkultrb/41923
[238] https://t.me/minkultrb/41948
[239] https://t.me/minkultrb/41955
[240] https://t.me/minkultrb/41956
[241] https://t.me/minkultrb/41820
[242] https://t.me/minkultrb/41890

- дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай працы Алег Хмялькоў прыняў удзел ва Усерасійскім фестывалі народнай творчасці і традыцый «Разам мы — Расія!» у Якуцку. У сваім выступе Алег Хмялькоў адзначыў, што сувязі паміж Якуціяй і Беларуссю мацнеюць[243].
- стала вядома, што 24 верасня ў Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя Масленікава адбудзецца ўрачыстае адкрыццё выставы «Наш Афон» фотамастака Костаса Амісіса (Расія). *«Госці музея змогуць дакрануцца да гісторыі зараджэння і развіцця рускага манаства»*. Праект рэалізуецца ў рамках Мемарандума аб супрацоўніцтве музея і Бранскага абласнога мастацкага музейна-выставачнага цэнтра[244].
- дэлегацыя музея-запаведніка «Нясвіж» наведала з рабочым візітам Рэспубліку Татарстан Расійскай Федэрацыі. У мэтах абмену вопытам у галіне захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама ў мэтах развіцця міжкультурнага дыялогу былі заключаны Пагадненні аб супрацоўніцтве з дзяржаўнымі гісторыка-архітэктурнымі і мастацкімі музеямі-запаведнікамі «Востраў-град Свіяжск» і «Казанскі Крэмль»[245].
- стала вядома, што 21 верасня НАДТ імя М. Горкага прыме ўдзел у Фестывалі рускіх замежных тэатраў «Тэатральная восень» (г. Ніжні Ноўгарад, Расія) са спектаклем «Казкі Пушкіна» (па Пушкіну), рэжысёр — заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргей Кавальчык. А з 23 па 24 верасня на сцэне Ульянаўскага драматычнага тэатра імя Ганчарова адбудуцца паказы нашых спектакляў «Казкі Пушкіна» (па Пушкіну), «Адуркаваны муж» (па Ж.-Б. Мальеру), «OPUS 40. Беспрыданніца» ( па Астроўскаму) ў рамках праграмы «Вялікія гастролі 2024» пры садзейнічанні Усерасійскага гастрольна-канцэртнага плана Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі[246].

***Кітай:***
- дэлегацыя з Кітая наведала Цэнтр культуры «Віцебск». Тут адбылася сустрэча прадстаўнікоў дырэкцыі фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» з дэлегацыяй Парку індустрыі Кітая і Беларусі Beijing Zhongbai Business Management на чале з іх генеральнымі дырэктарамі Глебам Лапіцкім і Лей Ма. За круглым сталом абмяркоўваліся магчымасці гуманітарнага супрацоўніцтва[247].

***Зімбабвэ:***
- у межах X Санкт-Пецярбургскага форуму аб’яднаных культур Міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч сустрэўся з намеснікам Міністра

[243] https://t.me/minkultrb/41900
[244] https://t.me/minkultrb/41904
[245] https://t.me/minkultrb/41939
[246] https://t.me/minkultrb/42120
[247] https://t.me/minkultrb/41835

спорту, мастацтва і культуры Рэспублікі Зімбабвэ Эмілі Джысая. Калегі з Зімбабвэ пацвердзілі зацікаўленасць у развіцці культурнага супрацоўніцтва і шматбаковага ўзаемадзеяння паміж дзяржавамі. Бакі дамовіліся падпісаць міжведамаснае пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры[248].

***Егіпет:***
- у межах X Санкт-Пецярбургскага форуму аб'яднаных культур адбылася сустрэча Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатоля Маркевіча і Міністра культуры Арабскай Рэспублікі Егіпет Ахмеда Фуада Хано. Кіраўнікі міністэрстваў дамовіліся актуалізаваць дзейную дагаворную базу, аднавіць практыку правядзення абменных Дзён культуры, пашыраць супрацоўніцтва ў галіне захавання культурнай спадчыны, у тым ліку на пляцоўках міжнародных культурных форумаў[249].

***БРІКС:***
- на X Санкт-Пецярбургскім форуме аб'яднаных культур прэзідэнт Дзелавога савета БРІКС Вісэнтэ Барыентас у час размовы з Міністрам культуры Беларусі Анатолем Маркевічам выказаў зацікаўленасць ва ўдзеле Беларусі ў культурных ініцыятывах БРІКС. Анатоль Маркевіч пацвердзіў, што прадстаўнікі культурнай сферы нашай краіны гатовы да супрацоўніцтва і адкрыты новым ініцыятывам і праектам[250].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 11 па 20 верасня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:
**- Майстар-клас па мезенскім роспісе** *(Мінск)*. Творчая майстэрня Рускага Дома ў Мінску зноў адчыніла дзверы для школьнікаў, каб расказаць пра рускі народны промысел. Гэтым разам мезенскі роспіс пад кіраўніцтвам мастака-педагога Людмілы Савойкі асвойвалі навучэнцы мінскай Сярэдняй школы № 70 імя Гурцьева[251].
**- Адкрыццё выставы «Ценішоўскія традыцыі рукадзелля»** *(Мінск)*. Стала вядома, што выстава адкрыецца 4 кастрычніка ў Рускім Доме ў Мінску ў

[248] https://t.me/minkultrb/41921
[249] https://t.me/minkultrb/41936
[250] https://t.me/minkultrb/41924
[251] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14775

рамках праекта Фонду імя братоў Магілёўцавых «Культурная місія М. К. Цянішавай». *«Наведвальнікі выставы адчуць усю сілу і разнастайнасць рускай народнай творчасці».* Праект адбудзецца пры падтрымцы Фонду «Рускі свет» і Рускага Дома ў Мінску[252].

**- Візіт кіраўніка Рускага Дома ў Гомелі Вольгі Бараненкі ў Жлобін.** У ходзе сустрэчы са старшынёй Жлобінскага райвыканкама Сяргеем Ярцам, старшынёй раённага Савета дэпутатаў, а таксама раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» Валянцінай Няхай і намеснікам начальніка аддзела адукацыі Жлобінскага райвыканкама Арцёмам Котам былі абмеркаваны перспектывы сумеснай працы ў розных сферах. Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі значнасць культурнага абмену і адукацыйных праграм, якія могуць *«узбагаціць жыццё мясцовага насельніцтва».* Сумесна былі намечаны шляхі супрацоўніцтва, накіраваныя на развіццё праектаў, якія *«спрыяюць умацаванню дружбы паміж брацкімі народамі і пашырэнню гарызонтаў для моладзі»*[253,254]. Прадстаўнікі Рускага Дома ў Гомелі наведалі Сярэднюю школу № 9 горада Жлобіна і перадалі ў дар кнігі, сярод якіх як навучальная, так і мастацкая літаратура на рускай мове[255].

**- Візіт кіраўніка Рускага Дома ў Гомелі Вольгі Бараненкі ў Калінкавічы.** На сустрэчы прысутнічалі старшыня райвыканкама Сяргей Гвоздзь, намеснік старшыні райвыканкама Ірына Шакалян і начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкама Іна Сафронава. Бакі выказалі зацікаўленасць у далейшым супрацоўніцтве ў сферы адукацыі і культуры[256]. Рускі Дом у Гомелі перадаў у дар Цэнтральнай раённай бібліятэцы г. Калінкавічы 60 кніг[257].

**- Паказ дакументальнага фільма пра савецкага лётчыка-касманаўта «Гагарын: абдымаючы свет»** *(Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Гродне).* Паказ быў арганізаваны для навучэнцаў школ[258,259].

**- Мерапрыемства, прысвечанае Сусветнаму дню рускага яднання** *(Гродна).* Супрацоўнікі Рускага Дома ў Гродне расказалі студэнтам факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Янкі Купалы пра гісторыю і традыцыі свята, а таксама сілу адзінства. Студэнты прынялі ўдзел у інтэрактыўнай віктарыне, паспрабавалі рускія прысмакі і зрабілі памятныя фота ў тэматычнай фотазоне. На заканчэнне сустрэчы кожны ўдзельнік атрымаў паштоўку, створаную з дапамогай нейрасеткі з нагоды свята. Сімвалам свята з'яўляецца руская бярозка[260,261].

---

[252] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14808
[253] https://t.me/russiangomel/4873
[254] https://t.me/russiangomel/4889
[255] https://t.me/russiangomel/4898
[256] https://t.me/russiangomel/5003
[257] https://t.me/russiangomel/5007
[258] https://t.me/russiangomel/5026
[259] https://t.me/russkiydomvgrodno/1821
[260] https://t.me/russkiydomvgrodno/1834
[261] https://t.me/russkiydomvgrodno/1840

**- Адкрыцце мемарыяльнай дошкі на будынку СШ N 23 г. Брэста ім. Героя Савецкага Саюза П. М. Гаўрылава** *(Брэст).* Актыў «Рускага таварыства» і ўдзельнікі аўтапрабегу «Садружнасць» былі запрошаны ўдзельнічаць ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі[262].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 11-20 верасня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр гістарычнай памяці пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы захавання гістарычнай памяці, процідзеяння скажэнню гістарычнай праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны і генацыдзе савецкага народа.**
Падпісанне пагаднення адбылося ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой»[263]. Выступаючы перад удзельнікамі сустрэчы, Генеральны консул Расіі ў Брэсце А. Мурашаў падкрэсліў, што *«падпісаны дакумент паслужыць умацаванню духоўнага адзінства брацкіх народаў Расіі і Беларусі».* У рамках мерапрыемства таксама адбыўся дыялог з прадстаўнікамі маладзёжных арганізацый, студэнтамі вядучых ВНУ горада аб важнасці захавання гістарычнай праўды, барацьбы з фальсіфікацыяй гісторыі[264].

***

**Дэлегацыя фонду «Мой радавод» Расійскай Федэрацыі і Уладзімір Міхайлавіч Дзяржынскі, унучаты пляменнік Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага, з рабочым візітам наведалі Ліцэй ім. Ф. Э. Дзяржынскага БДУ.**
Пасля прагляду дакументальнага фільма пра Фелікса Дзяржынскага госці расказалі пра неабходнасць падтрымкі сямейных каштоўнасцяў, маштаб асобы Фелікса Эдмундавіча, перапляценні асабістага і дзяржаўнага ў сям'і Дзяржынскіх[265].

---

[262] https://t.me/rcnkbrest/24253
[263] https://t.me/rcnkbrest/24180
[264] https://t.me/rcnkbrest/24182
[265] https://t.me/LyceumBSU/1944

***

**У эфіры праграмы «Азаронак. Напрямую» дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня таварыства «Веды» кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін выказаўся пра «шкоднасць міфа аб Каліноўскім» і назваў палітыку Рэчы Паспалітай этнацыдам беларускага народа.**

Прапагандыст прызнаў, што беларусы лічаць Каліноўскага героем і таму сканцэнтраваўся на крытыцы меркавання часткі праўладнага лагеру, што *«не такі ён і дрэнны, давайце хаця б яго цень пакінем»*. *«Чым шкодны міф аб Каліноўскім?»*, — задае пытанне прапагандыст і тлумачыць: *«У Савецкім Саюзе, у савецкай Беларусі не гаварылі ўсю праўду пра яго. З яго рабілі фігуру, якая не адпавядала рэчаіснасці. Фігуру народнага правадыра, змагара перадусім за нейкія сацыяльныя даброты. Так, ён лічыў, для таго, каб дабіцца мэты — вызваліць польскую Рэч Паспалітую з-пад улады Расіі — неабходна рабіць стаўку не толькі на шляхту, але і на сялянства. Вось у гэтым непасрэдна і быў яго радыкалізм. Хаця нейкай дакладнай сацыяльнай праграмы ў яго і яго прыхільнікаў не было»*. Але, заўважае Гігін, *«калі мы пачытаем "Мужыцкую праўду", загады яго жонду — гэта ж загады, якія супярэчаць духу беларускай нацыі»*. На погляд прапагандыста, яны *«распальваюць нянавісць да рускіх, праваслаўных»*[266]. Акрамя таго, Гігін выказаўся і пра час, калі Беларусь была ў складзе Рэчы Паспалітай: *«Рэч Паспалітая будавалася на ўціску іншых народаў, на выкараненні беларускасці. У Рэчы Паспалітай была знішчана старабеларуская культура. Вось што такое была Рэч Паспалітая. Таму мы адмоўна ацэньваем яе палітыку, называем яе этнацыдам. І ў гэтай канцэпцыі даецца адназначна адмоўная ацэнка тром польскім паўстанням»*[267].

***

**Гісторыка Ігара Мельнікава прысудзілі да 4 гадоў калоніі[268].**

Фармальна Мельнікава судзілі за інтэрв'ю незалежнаму СМІ, якое ён даў у 2022 годзе. Газета адміністрацыі Лукашэнкі выставіла і свае абвінавачванні на адрас Мельнікава. У рэпартажы гаворыцца, што ён *«у сваіх так званых працах адкрыта ўслаўляў польскіх паноў, якія гадамі прыгняталі беларускі народ, выказваў асаблівую любоў да баевікоў з Арміі Краёвай»*[269]. Нагадаем, што яшчэ ў жніўні суд у Мінску прызнаў «экстрэмісцкімі» кнігі Мельнікава, а сам ён больш за паўгода знаходзіцца ў зняволенні[270].

***

[266] https://nashaniva.com/351215
[267] https://t.me/Gigin_Vadim/1927
[268] https://nashaniva.com/351249
[269] https://nashaniva.com/351041
[270] https://news.zerkalo.io/life/77100.html?c

**Ва Уфе прайшоў XVII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі СНД. У ім прынялі ўдзел каля 200 прадстаўнікоў краін Садружнасці.**
На пленарных пасяджэннях і ў профільных секцыях дзеячы навукі, адукацыі і мастацтва абмеркавалі розныя аспекты прафесійнага ўзаемадзеяння: новыя фарматы супрацоўніцтва ў адукацыйнай сферы, інтэграцыйныя працэсы ў фарміраванні міжкультурнага дыялогу. На палях форуму адбыліся сустрэчы кіраўнікоў профільных гуманітарных аб'яднанняў СНД: круглыя сталы правялі кінематаграфісты, кіраўнікі творчых ВНУ, спецыялісты па арганізацыі інклюзіўных праектаў. Асобная сустрэча была прысвечана падрыхтоўцы да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне[271].

***

**У Мінску прайшлі Дні Екацярынбурга. Мерапрыемства праводзілася падчас святкавання 957-годдзя беларускай сталіцы.**
Расійскі бок прадставіў у мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага выставу вядомага ўральскага мастака Аляксея Яфрэмава і экспазіцыю пра Екацярынбург. Жыхароў і гасцей Мінска ў Верхнім горадзе чакала канцэртная праграма «З Екацярынбурга з любоўю». Акрамя таго, былі арганізаваны двухбаковыя сустрэчы прадстаўнікоў вышэйшых навучальных установ для абмеркавання перспектыў адукацыйнага супрацоўніцтва. Таксама прайшла сустрэча бібліятэчных супольнасцяў. У адной з бібліятэк Мінска быў створаны куток Екацярынбурга[272].

***

**У Дзень народнага адзінства на пляцоўцы каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшла культурна-патрыятычная акцыя «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць».**
У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўнік адміністрацыі Першамайскага раёна Вадзім Пярэдня, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін і іншыя. *«Акцыя накіравана на фарміраванне ў маладога пакалення грамадзянска-патрыятычных якасцей і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі нашай краіны»*[273]. Тым часам у выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі адбылося адкрыццё выставачнага праекта «Назаўжды разам», прымеркаванага да 85-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР[274].

***

**У Магілёве адкрылі праспект «17-га верасня».**

[271] https://belta.by/society/view/forum-tvorcheskoj-i-nauchnoj-intelligentsii-sng-projdet-17-19-sentjabrja-v-ufe-661460-2024/
[272] https://soyuz.by/obshchestvo/v-minske-proydut-dni-ekaterinburga-1
[273] https://t.me/libraryofbel/4502
[274] https://t.me/libraryofbel/4496

Гэта ўчастак новай гарадской магістралі, які злучае мікраараёны Казіміроўку, Спадарожнік, Касманаўтаў[275].

***

**У Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна прайшла першая кіналекцыя з цыкла літаратурна-гістарычных мерапрыемстваў «Францыя. Беларускі след». Цыкл прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**
У якасці лектара выступіў беларускі прадзюсар і рэжысёр дакументальных фільмаў Уладзімір Бокун. Адной з яго работ з'яўляецца стужка «"Радзіма" ці смерць. З Надзеяй — за Францыю», прысвечаная партызанскаму атраду «Радзіма», які складаўся са славянскіх жанчын і дзейнічаў на тэрыторыі Францыі ў часы Другой сусветнай вайны[276].

***

**Гомельская пракуратура запатрабавала ад «Яндекс Музыки» выдаліць песні рагачоўскага гурта Tor Band.**
Цяпер з беларускага IP на сэрвісе «Яндекс Музыка» сапраўды нельга праслухаць частку кампазіцый Tor Band (напрыклад, «Мы — не народец», «Жыве», «Кто, если не ты?», «Dead Мороз») — сэрвіс інфармуе: *«Трэк не даступны па патрабаванні дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь».* Пры гэтым цалкам старонку групы не выдалілі. З іншых лакацый даступныя ўсе кампазіцыі гурта. Нагадаем, Рагачоўскі гурт Tor Band займеў папулярнасьць у Беларусі на хвалі пратэстаў 2020 году. Музыкаў Tor Band затрымалі 28 кастрычніка 2022 года. 31 кастрычніка агучылі вырак: Дзмітры Галавач атрымаў 9 гадоў узмоцненага рэжыму. Яўген Бурло — 8 гадоў узмоцненага рэжыму, Андрэй Ярэмчык — 7,5 года ўзмоцненага рэжыму, а таксама буйныя штрафы[277].

***

**Амерыканскае агенцтва Associated Press апублікавала артыкул пра тое, як у Беларусі знікае родная мова, а расійская займае першыя ролі.**
Журналісты Associated Press у пачатку артыкула расказваюць гісторыю 15-гадовага беларуса Мікалая, які сёлета выявіў, што настаўнікі і адміністратары ягонай школы больш не называюць яго такім імем. Замест гэтага яны называюць яго Нікалаем, ужываючы расійскі эквівалент ягонага імя. Больш за тое, заняткі ў яго школе — адной з лепшых у краіне — цяпер вядуцца на расійскай мове, а не на беларускай, на якой ён размаўляў большую частку жыцця. *«Такія беларусы, як Мікалай, перажываюць новую хвалю русіфікацыі, калі Масква пашырае сваё эканамічнае, палітычнае і культурнае панаванне, каб пераняць ідэнтычнасць свайго*

[275] https://t.me/euroradio/57032
[276] https://t.me/kultinfa/8614
[277] https://www.svaboda.org/a/33124510.html

*суседа»,*— піша агенцтва і згадвае, як гэта рабілася раней, калі Расія пры царах і ў часы Савецкага Саюза навязвала Беларусі сваю мову, сімвалы і культурныя інстытуты[278].

***

**«Беларусьфільм» прадставіў трэйлер «Чорнага замка» — экранізацыі рамана Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі».**
Цікава, што сярод выканаўцаў галоўных роляў — спрэс расійскія акторы. Беларускія акторы таксама ёсць, але фігуруюць на другім і трэцім планах. Зняў фільм расійскі рэжысёр Кірыл Кузін, аўтар фільмаў «Самы лепшы фільм», «Вайна палоў», «Залётчыкі»[279,280]. Мова фільма — руская. 12 верасня стужку паказалі ў кінатэатры «Беларусь» дзяржаўнай прэсе і медыйшчыкам[281].

***

**«Беларусьфільм» разам з «Татаркіно» плануе зняць фільм пра вайну ва Украіне. Гэта будзе фільм пра айцішнікаў, якія з дапамогай спецыяльнай праграмы ўплываюць на ваенныя дзеянні.**
Аб гэтым расказаў гендырэктар кінастудыі Юрый Аляксей на пляцоўцы Санкт-Пецярбургскага міжнароднага культурнага форуму. Паводле слоў кіраўніка «Беларусьфільма», тэма спецаперацыі для беларускага гледача цікавая і важная, таму што *«Беларусь і Расія — дзве саюзныя краіны з аднымі каранямі, культурай і фальклорам». «Сам Бог загадаў нам сябраваць і ўмацоўваць межы. Мы мяжуем з Літвой, Польшчай, і гэта тыя ж межы Расійскай Федэрацыі — наш прэзідэнт абараняе яе мяжу на той мяжы, РФ абараняе Беларусь на іншых межах, гэта адна сістэма. Я ўпэўнены, што праз сумесныя фільмы і прадукцыю мы ўмацуем сяброўства дзвюх дзяржаў»,* — сказаў Аляксей. Таксама кіраўнік кінастудыі ўказаў на важнасць выпрацоўкі ў Расіі, Кіргізіі і іншых краінах адной сістэмы па фінансаванні сумесных праектаў. Ён зазначыў, што Расія ў гэтым выпадку зойме асноўныя пазіцыі, як *«старэйшы брат, які павінен аб'яднаць кінаіндустрыі»*[282].

---

[278] https://www.svaboda.org/a/33119865.html
[279] https://t.me/holybelawood/4797
[280] https://t.me/euroradio/56933
[281] https://nashaniva.com/351144
[282] https://t.me/holybelawood/4801

**У Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла прэс-канферэнцыя аб падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства», у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся Адзіны дзень інфармавання на тэму «Мы разам назаўжды: да 85-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР», у Віцебску і Берасці прайшлі Дні Крыма з нагоды «10-гадовага юбілею ўз'яднання паўвострава з Расіяй», Сусветны Рускі народны Сабор правёў у Смаленску форум па абароне традыцыйных каштоўнасцяў: «Рускі Свет супраць нацызму», у якім удзельнічалі і прадстаўнікі Беларусі, у Мінску прайшло пасяджэнне Рабочай групы па турызме ў рамках Саюзнай дзяржавы, Пракуратура Гродзенскай вобласці запатрабавала «ўдасканаліць» гісторыка-культурны турызм і ўключыць у экскурсійныя маршруты наведванне помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, у Бешанковічах адкрылі бюст Героя Савецкага Саюза Паўла Раманава, на тэрыторыі завода «СтанкаГомель» ізноў з'явіўся помнік расійскаму камуністу Сяргею Кіраву, адзін былы палітвязень расказаў пра расійскі трыкалор, сцяг СССР, партрэты Сталіна і Дзяржынскага ў кабінеце ГУБАЗіК, а іншы — што ў калоніі пад Магілёвам спалілі дзве тачкі беларускіх кніг і ўсяго Оруэла, Якуція прапанавала Беларусі супрацоўніцтва ў сферы кінавытворчасці — навіны культуры за перыяд 21-30 верасня 2024 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 21-30 верасня 2024 года на афіцыйным сайце[283] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь была апублікавана 1 навіна, якая была прысвечана правядзенню XXVII Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анімаёўка-2024»[284]. Афіцыйны тэлеграм-канал[285] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 95 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 70 |
| Беларуская | 24 |
| Абедзве | 1 |

[283] https://www.kultura.by/

[284] https://www.kultura.by/news/25-27-verasnya-goradze-magilyeve-i-magilye-skay-voblastsi-prakhodzits-xxvii-mizhnarodny-festyval-ani/

[285] https://t.me/MinobrofBelarus

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 12 навін;
• культурная тэматыка — 28 навін;
• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 11 навін;
• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 39 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч:***
- накіраваў словы прывітання ўдзельнікам і гасцям IV Міжнароднага фестывалю «Лялькі над Нёманам»[286] і XXVII Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анімаёўка-2024»[287].
- прыняў удзел у прэс-канферэнцыі, прысвечанай рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства»[288].

***Першы намеснік Міністра культуры Валерый Грамада:***
- прыняў удзел у правядзенні Дзён культуры Беларусі ў Навасібірску (РФ)[289,290,291,292,293]. У рамках мерапрыемства наведаў Навасібірскі дзяржаўны мастацкі музей, дзе азнаёміўся з часовай экспазіцыяй «Дзяржаўны Эрмітаж. Парадны выезд імператарскага двара» са збору Дзяржаўнага Эрмітажа[294], шэраг устаноў і арганізацый у Навасібірску, дасягнуў дамоўленасці аб сумесным правядзенні анлайн-лекцый для студэнтаў па тэме «Музыка ў кіно»[295].

***Намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Сяргей Саракач:***
- прыняў удзел у пасяджэнні Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь[296].

***Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Іна Адамовіч:***

---

286 https://t.me/minkultrb/42311
287 https://t.me/minkultrb/42402
288 https://t.me/minkultrb/42421
289 https://t.me/minkultrb/42361
290 https://t.me/minkultrb/42511
291 https://t.me/minkultrb/42517
292 https://t.me/minkultrb/42518
293 https://t.me/minkultrb/42527
294 https://t.me/minkultrb/42514
295 https://t.me/minkultrb/42551
296 https://t.me/minkultrb/42352

- выступіла спікерам у Маладзёжным тэатры эстрады, дзе адбыўся адзіны дзень інфармавання на тэму «Мы разам назаўжды: да 85-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі і БССР»[297].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**
- на сцэне Вялікага тэатра прайшла прэм’ера спектакля «Патэтычны дзённік памяці». Гэта творчы праект на аснове твораў беларускіх кампазітараў і дакументальных сведчанняў трагедыі і гераізму беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны[298]. Таксама стала вядома, што 13 кастрычніка тэлеканал «Беларусь 3» прадставіць тэлеверсію творчага праекта[299].
- на пляцоўцы каля Слуцкага краязнаўчага музея прайшла выстава карцін «Партызанскімі сцежкамі, франтавымі дарогамі». Выстава прымеркавана да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў[300].
- у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» адкрылася выстава інсталяцый пад назвай «Дарога да міру». Прадстаўленыя экспанаты ілюструюць творы савецкіх пісьменнікаў — удзельнікаў і сведак ваенных дзеянняў. Арганізатары праекта: Дзяржаўны музей гісторыі расійскай літаратуры імя Даля і мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»[301].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 39 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:
Расія — 36 навін (15 з іх былі прысвечаны Дням культуры Беларусі ў Навасібірску);
Кітай — 2 навіны;
Зімбабвэ — 1 навіна;

***Расія:***
- у Навасібірску прайшлі Дні культуры Беларусі. Сярод асноўных мерапрыемстваў: Дні беларускага кіно, выставачны праект Нацыянальнага гістарычнага музея «Беларусь у рытме традыцый», гала-

[297] https://t.me/minkultrb/42347
[298] https://t.me/minkultrb/42312
[299] https://t.me/minkultrb/42387
[300] https://t.me/minkultrb/42469
[301] https://t.me/minkultrb/42604

канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі і іншыя[302,303,304,305,306,307,308,309,310,311,312,313,314,315,316].

- пад эгідай Дзяржынскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці ў Беларусі прайшоў штогадовы Інклюзіўны Міжнародны пленэр «R+Я». У ім прынялі ўдзел 11 жывапісцаў з Расіі і Беларусі. Пленэр «R+Я» — гэта *«тэрыторыя неацэннага абмену вопытам, сяброўскіх зносін, абсалютнага ўзаемаразумення, удасканалення майстэрства»*[317].
- у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы «Адкуль узяўся Пушкін», прадстаўленай для экспанавання Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам А. С. Пушкіна «Міхайлаўскае». Мерапрыемства прымеркавана да 225-годдзя з дня нараджэння рускага паэта[318].
- у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылася прэс-канферэнцыя «Сумесны выставачны праект Дзяржаўнага Рускага музея і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь “Расія-Беларусь. Скрыжаванне лёсаў”» з удзелам генеральнага дырэктара Дзяржаўнага Рускага музея Алы Манілавай і генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Ганны Конанавай. Сама выстава была прэзентавана ў Мармуровым Палацы (г. Санкт-Пецярбург) 14 верасня 2024 года ў рамках юбілейнага X Міжнароднага форуму аб’яднаных культур. Экспазіцыя прысвечана беларускім мастакам, якія прайшлі расійскую мастацкую школу[319]. У рамках прэс-канферэнцыі адбылося падпісанне абноўленай дамовы аб супрацоўніцтве паміж вядучымі музеямі ў галіне выяўленчага мастацтва Расіі і Беларусі тэрмінам на 5 гадоў[320].
- у межах падпісанага пагаднення аб супрацоўніцтве Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Нацыянальны літаратурны музей Рэспублікі Башкартастан (г. Уфа) прынялі ўдзел у сумесным круглым стале. Да анлайн-сустрэчы таксама далучылася Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Мерапрыемства мела назву «Пацалаваў бы разбураныя камяні Мінска…» і было прысвечана дзейнасці пісьменнікаў-франтавікоў Башкартастана ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Прадстаўнікі

[302] https://t.me/minkultrb/42361
[303] https://t.me/minkultrb/42473
[304] https://t.me/minkultrb/42475
[305] https://t.me/minkultrb/42487
[306] https://t.me/minkultrb/42492
[307] https://t.me/minkultrb/42508
[308] https://t.me/minkultrb/42509
[309] https://t.me/minkultrb/42510
[310] https://t.me/minkultrb/42511
[311] https://t.me/minkultrb/42514
[312] https://t.me/minkultrb/42516
[313] https://t.me/minkultrb/42517
[314] https://t.me/minkultrb/42518
[315] https://t.me/minkultrb/42527
[316] https://t.me/minkultrb/42551
[317] https://t.me/minkultrb/42324
[318] https://t.me/minkultrb/42375
[319] https://t.me/minkultrb/42385
[320] https://t.me/naukaicultura RossiivBelarusi/14926

бакоў абмяняліся прапановамі па далейшым супрацоўніцтве, абмеркавалі перспектывы развіцця літаратурнай садружнасці[321,322].

- дэлегацыя Дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка «Астаў-град Свіяжск» (Рэспубліка Татарстан, Расійская Федэрацыя) наведала з рабочым візітам музей-запаведнік «Нясвіж». У рамках дзеючага Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж установамі адбыўся круглы стол на тэму «Роля музеяў-запаведнікаў у захаванні культурнай і архітэктурнай спадчыны». Таксама калегі з Рэспублікі Татарстан у ходзе візіту абмеркавалі пытанні далейшага супрацоўніцтва[323].
- заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, народны ансамбль танца «Лявоніха» Цэнтра культуры «Віцебск» прыняў удзел у культурнай праграме XXIII Міжнароднага гандлёва-прамысловага Маргарыцінскага кірмашу ў Архангельску[324].
- у рамках міжнароднага культурнага супрацоўніцтва паміж Бранскай вобласцю Расійскай Федэрацыі і Магілёўскай вобласцю Беларусі:
  - адбыліся здымкі традыцыйных беларускіх строяў Магілёўскай вобласці. У 2025 годзе ў Дзень яднання Беларусі і Расіі будзе прадстаўлены сумесны выставачна-асветніцкі праект. Дамоўленасці аб гэтым былі дасягнуты паміж Дэпартаментам культуры Бранскай вобласці і Магілёўскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы[325].
  - Магілёўскі абласны тэатр лялек завяршыў гастролі ў Бранску, дзе паказаў пірацкую гісторыю «Прыгоды Джэка Вераб'я» паводле п'есы Ігара Казакова і спектакль «Пётр I — жыццё і дзеянні» — гістарычны парафраз Дзмітрыя Ярохіна. Усяго за чатыры дні было паказана 10 спектакляў[326].
- у Аршанскім раёне прайшоў Міжнародны пленэр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які сабраў майстроў-керамістаў з Беларусі і Расійскай Федэрацыі[327].
- прайшоў літаратурны флэшмоб «Беларусь-Расія. Чытаем любімыя кнігі разам», прымеркаваны да 80-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Удзел у флэшмобе прынялі Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна і Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Комі. Сіламі бібліятэк былі запісаны відэаролікі, у якіх прадстаўнікі навучальных устаноў прадэкламавалі твор Якуба Коласа на сваёй роднай мове[328].
- у рамках IX Усерасійскай метадычнай харавой асамблеі «ХорЭкспа — 2024» было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім

[321] https://t.me/minkultrb/42390
[322] https://t.me/minkultrb/42403
[323] https://t.me/minkultrb/42417
[324] https://t.me/minkultrb/42422
[325] https://t.me/minkultrb/42427
[326] https://t.me/minkultrb/42566
[327] https://t.me/minkultrb/42463
[328] https://t.me/minkultrb/42557

дзяржаўным музычным каледжам імя М. І. Глінкі і Цэнтрам творчага развіцця і музычна-эстэтычнай адукацыі дзяцей і юнацтва «Радасць» (РФ). Заключэнне пагаднення *«паслужыць развіццю плённага супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх дзіцяча-юнацкіх харавых калектываў, педагогаў-хармайстраў і настаўнікаў музыкі»*[329].

- Магілёўскі абласны драматычны тэатр прыняў удзел у IX Міжнародным тэатральным фестывалі «Смаленскі каўчэг» (РФ)[330].

- Стала вядома, што:
  - 3-4 кастрычніка ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі адбудзецца III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Музейныя здабыткі. Вялікая Айчынная вайна ў сучаснай музейнай прасторы», прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Галоўная мэта канферэнцыі — сістэматызацыя ведаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўленасць гэтай тэмы ў музеях Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама ў прыватных калекцыях. У канферэнцыі прымуць удзел каля 50 вучоных і музейшчыкаў з Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі[331].
  - 5 кастрычніка ў Мінску пройдуць гастролі Маладзёжнага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра. У Вялікай канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі выступяць 60 студэнтаў расійскіх музычных ВНУ і 30 студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі[332].
  - 22 кастрычніка на сцэне Палаца культуры г. Маладзечна выступяць артысты Рускага Нацыянальнага класічнага балета пад кіраўніцтвам Ганны Няхлюдавай са спектаклем «Эсмеральда» ў 2-х дзеях паводле рамана Віктора Гюго «Сабор Парыжскай Божай Маці»[333].

***Кітай:***

- 23 верасня Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з працоўным візітам наведала дэлегацыя Маўзалея Сунь Ятсена (г. Нанкін, Кітай). Кітайскія калегі азнаёміліся з экспазіцыяй музея, пасля чаго адбылася рабочая сустрэча членаў дэлегацыі з кіраўніцтвам установы, у ходзе якой паміж бакамі быў дасягнуты шэраг дамоўленасцей аб супрацоўніцтве ў навуковай-экспазіцыйнай дзейнасці. Так, напрыклад, ужо ў лістападзе гэтага года ў Нанкін будзе адкрыта часовая экспазіцыя, матэрыялы для якой будуць прадстаўлены ў тым ліку і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. А ў жніўні 2025 года ў КНР будзе прадстаўлены сумесны выставачны праект, прысвечаны 80-годдзю заканчэння савецка-японскай вайны[334].

---

[329] https://t.me/minkultrb/42570
[330] https://t.me/minkultrb/42574
[331] https://t.me/minkultrb/42569
[332] https://t.me/minkultrb/42515
[333] https://t.me/minkultrb/42242
[334] https://t.me/minkultrb/42334

- у Пекіне адкрылася выстава «Летапіс Брэсцкай крэпасці ў фатаграфіях». Мерапрыемства адбылося ў Мемарыяльным музеі антыяпонскай вайны кітайскага народа і прымеркавана да 53-й гадавіны з дня адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». У адкрыцці выставы прыняў удзел дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Аляксандр Каркатадзе[335].

***Зімбабвэ:***

- Нацыянальную бібліятэку Беларусі наведала дэлегацыя Зімбабвэ. Для дэлегацыі была арганізавана кніжная выстава-прагляд, на якой было прадстаўлена каля 80 выданняў з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: альбомы, даведачна-інфармацыйныя, навуковыя, навукова-папулярныя выданні пра Паўднёвую Афрыку і Зімбабвэ[336].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг. У перыяд з 21 па 30 верасня 2024 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Рускім Домам у Гродне і Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам.** Яго падпісалі кіраўнік Рускага дома ў Гродне Алена Літвішчанка і першы прарэктар ГрДМУ Андрэй Болтач. Мэтай Мемарандума з’яўляецца далейшае супрацоўніцтва ў адукацыйнай, культурнай, навуковай і асветніцкай галінах, а таксама пашырэнне сфер узаемных інтарэсаў абодвух партнёраў[337].

**- наведванне Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П. І. Баграціёна.** Кіраўнік Рускага Дома ў Гродне Алена Літвішчанка і Старшыня Гродзенскай гарадской арганізацыі ветэранаў Аляксандр Радзівонаў сустрэліся з дырэктарам музея Вольгай Суетой і абмеркавалі магчымыя формы далейшага ўзаемадзеяння[338].

**- урачыстае адкрыццё выставы «Людзі новых рэгіёнаў», прымеркаванай да Дня ўз’яднання Данецкай і Луганскай народных рэспублік, Запарожскай і Херсонскай абласцей з Расіяй** *(Рускі Дом у Гродне).* Увазе гасцей былі прадстаўлены экспазіцыя з фатаграфій

[335] https://t.me/minkultrb/42465
[336] https://t.me/minkultrb/42446
[337] https://t.me/russkiydomvgrodno/1908
[338] https://t.me/russkiydomvgrodno/1898

жыхароў «новых рэгіёнаў» і іх аповедаў аб тым, як змянілася іх жыццё пасля «ўз'яднання» з Расіяй, а таксама дакументальны фільм «Данбас: шлях да міру» і зварот Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з нагоды Дня ўз'яднання[339].

**- мерапрыемства на тэму «Вялікая Айчынная вайна»** *(Гомель).* Мерапрыемства адбылося ў ваенна-патрыятычным клубе «Лазурыт» пры падтрымцы Рускага Дома ў Гомелі. У праграма мерапрыемства: прагляд фільма «Aurus» *(«з якога хлопцы даведаліся шмат новага аб аўтамабілі Прэзідэнта Расіі»),* віктарына, ваенізаваная эстафета (бег з разборам і зборам аўтамата, бег з процівагазам, пераадоленне «пасткі», стрэлы з аўтамата па мішэні)[340].

**- урачыстае адкрыццё выставы «Барыс Гадуноў. Гісторыя, героі, версіі», прымеркаванай да юбілею рускага кампазітара Мадэста Мусаргскага** *(Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж).* Выстава складаецца з трох тэматычных блокаў: «Гісторыя стварэння і першай пастаноўкі оперы», «Альтэрнатыўныя погляды на шэдэўр» і «Опера Мусаргскага ў сцэнічных увасабленнях у канцы XIX-XXI стагоддзях». Таксама ў рамках мерапрыемства прайшоў канцэрт, дзе прагучалі вядомыя творы кампазітара[341].

**- паказ дакументальнага фільма «Абдымаючы свет»** *(Мінск).* Кінапаказ адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі. У аснову кароткаметражнай карціны леглі кадры кінахронікі «Місіі свету» першага касманаўта Юрыя Гагарына, інтэрв'ю з работнікамі касмічнай галіны. Праект рэалізаваны Аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй «9 Мая» пры падтрымцы Прэзідэнцкага фонду культурных ініцыятыў, Дзяржкарпарацыі «Раскосмас», НДІ ЦПК імя Ю. А. Гагарына, Рассупрацоўніцтва і Этнаграфічнага парка-музея «ЭТНАМІР»[342].

**- выстава «Руская літаратура: ад класікі да сучаснасці»** *(Дзіцячая бібліятэка-філіял імя А. С. Пушкіна, Магілёў).* Адкрыццё кніжнай экспазіцыі адбылося да 75-годдзя з дня заснавання бібліятэкі. Госці мерапрыемства наведалі літаратурную фотазону і пазнаёміліся з кнігамі, перададзенымі ў дар прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь[343].

**- «Літаратурная дыктоўка»** *(Мінск, Гродна).* Пры падтрымцы Рускага Дома студэнты Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, а таксама школьнікі, студэнты і выкладчыкі г. Гродна прынялі ўдзел у штогадовай асветніцкай акцыі, прысвечанай рускай літаратуры. Удзельнікі «Літаратурнай дыктоўкі» павінны былі адказаць на 20 пытанняў, падрыхтаваных спецыялістамі Мурманскай абласной навуковай бібліятэкі

---

[339] https://t.me/russkiydomvgrodno/1975
[340] https://t.me/russiangomel/5100
[341] https://t.me/russkiydomvgrodno/1921
[342] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14883
[343] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14928

і Усерасійскай бібліятэкі замежнай літаратуры ім. Рудаміна[344,345]. Акцыя прайшла таксама ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі[346].
**- сустрэча ў размоўным клубе «Рускі як замежны»** *(офіс Рускага Дома ў Гомелі).* Клуб распачаў дзейнасць яшчэ ў пачатку верасня для замежных студэнтаў, якія жывуць у Беларусі[347]. Другое пасяджэнне клуба адбылося ў фармаце літаратурнай сустрэчы. Гасцямі мерапрыемства сталі сучасныя расійскія пісьменнікі: Мікалай Мялешкін, Алена Кукіна і Барыс Куцянкоў[348].
**- акцыя «Бібліяноч»** *(Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. І. Герцэна, Гомель).* Сярод мерапрыемстваў: рускія рамансы, тэатральныя сцэнкі «Свецкая размова на балі» і «Арыстакраты», свабодны мікрафон «Чытаем паэзію 19 стагоддзя», выстава-віктарына «Залатое стагоддзе рускай культуры»[349].
**- першы танцавальны конкурс «Танцы без правілаў»** *(Рускі Дом у Гродне).* Удзел у конкурсе прынялі студэнты лячэбнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Конкурс складаўся з чатырох этапаў, першым з якіх была размінка — «Рускі народны танец»[350].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 21-30 верасня 2024 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**У Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла прэс-канферэнцыя аб падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства».**
На ўрачыстым мерапрыемстве да Дня народнага адзінства 17 верасня Аляксандр Лукашэнка аб’явіў аб старце рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» і расказаў, чаго чакае ад акцыі: *«Гэта будзе марафон трыадзінства традыцый: нацыянальнай культуры, якую беражліва захоўваем і развіваем, талентаў нашых людзей, якімі славіцца беларуская зямля, прыгажосці славянскай душы, якая напаўняе свет вакол гармоніяй і ўзаемаразуменнем».* Мерапрыемствы акцыі «Марафон адзінства» ў той ці іншай ступені ахопяць усю Беларусь. У

[344] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/14950
[345] https://t.me/russkiydomvgrodno/1952
[346] https://t.me/libraryofbel/4689
[347] https://t.me/russiangomel/4826
[348] https://t.me/russiangomel/5130
[349] https://t.me/russiangomel/5138
[350] https://t.me/russkiydomvgrodno/1934

падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў задзейнічаны: Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства спорту і турызму, Мінгарвыканкам, абласныя выканаўчыя камітэты, ТАА «Музычная медыякампанія», ДУ «Палац Рэспублікі» Упраўлення спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, УП «БелТА», Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, БРСМ, Белтэлерадыёкампанія, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, РДГА «Беларускае таварыства “Веды”» і інш[351].

***

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся Адзіны дзень інфармавання на тэму «Мы разам назаўжды: да 85-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі і БССР».**

Перад калектывам бібліятэкі выступіў філосаф, публіцыст, палітычны аглядальнік Аляксей Дзермант, які расказаў пра гістарычныя падзеі, якія папярэднічалі ўз’яднанню Беларусі[352].

***

**У Віцебску і Берасці прайшлі Дні Крыма з нагоды «10-гадовага юбілею ўз’яднання паўвострава з Расіяй».**

Адбыліся сустрэчы, форумы і канцэрты. Сярод тэм — 80-годзьдзе вызвалення *«зямель саюзнай дзяржавы і паўвострава ад фашыстаў»*, а таксама абмеркаванне *«працэсу скажэння гісторыі вызвалення краін савецкай арміяй ад фашыстаў і аднаўлення хcraналогіі падзей Другой сусветнай вайны»*. У Берасці адбыўся канцэрт «Песні і танцы народаў Крыма»[353]. Закрыў Дні Рэспублікі Крым у Брэсце круглы стол «Беларусь і Крым: гістарычныя паралелі», які быў праведзены на базе Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя Суворава[354].

***

**Сусветны Рускі народны Сабор правёў у Смаленску форум па абароне традыцыйных каштоўнасцяў: «Рускі Свет супраць нацызму», у якім удзельнічалі і прадстаўнікі Беларусі.**

Ад імя Беларускага Экзархата ўдзельнікаў форуму прывітаў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін. З дакладамі выступілі старшыня Сінадальнай гістарычнай камісіі Беларускага Экзархата, протаіерэй Аляксандр Раманчук і настаяцельніца Гродзенскага Свята-Раждажаство-Багародзічнага жаночага манастыра ігумення Гаўрыіла (Глухава)[355].

---

[351] https://bpc.by/ru/press-meropriyatiya/item/2137-anons-press-konferentsiya-o-podgotovke-i-provedenii-respublikanskoj-obshchestvenno-kulturnoj-aktsii-marafon-edinstva.html
[352] https://t.me/libraryofbel/4640
[353] https://www.svaboda.org/a/33135840.html
[354] https://t.me/russkoebelarus/3206
[355] https://t.me/russkiydomvgrodno/1947

***

**У Мінску прайшло пасяджэнне Рабочай групы па турызме ў рамках Саюзнай дзяржавы.**

У ходзе нарады бакі разгледзелі і абмеркавалі шэраг пытанняў, сярод якіх стварэнне турыстычнага інфармацыйнага цэнтра Саюзнай дзяржавы «Дом Саюзнай дзяржавы». Па выніках нарады будзе падпісана «Дарожная карта» па развіццю турызму[356].

***

**Пракуратура Гродзенскай вобласці патрабуе «ўдасканаліць» гісторыка-культурны турызм і ўключыць у экскурсійныя маршруты наведванне помнікаў Вялікай Айчыннай вайны.**

У Дзятлаўскім райвыканкаме ўжо адрэагавалі — намеснік старшыні Вадзім Бялятка сабраў нараду з удзелам спецыялістаў сектара спорту і турызму райвыканкама, а таксама турыстычнага інфармацыйнага цэнтра. *«Увага звяртаецца на тое, каб помнікі і пахаванні воінаў і мірнага насельніцтва, загінулага ў Вялікай Айчыннай вайне, не толькі ўтрымліваліся ў належным стане, але былі ўключаны ў экскурсійныя маршруты»,* — паведаміў прысутным чыноўнік. Атрымліваецца, што турыстаў будуць часцей вазіць не да палацаў ці замкаў, а да магіл і помнікаў ахвярам вайны, расказваць пра генацыд[357].

***

**У Бешанковічах адкрылі бюст Героя Савецкага Саюза Паўла Раманава.**

Раманаў нарадзіўся ў Чыце, затым пражываў у Гомелі. У час Вялікай Айчыннай вайны ён стаў удзельнікам падпольнага руху. У яго гонар у Бешанковічах каля краязнаўчага музея і быў устаноўлены яго бюст[358].

***

**На тэрыторыі завода «СтанкаГомель» ізноў з'явіўся помнік расійскаму камуністу Сяргею Кіраву.**

Ягоным імем завод быў названы ў савецкі час. Да 2015 года скульптура стаяла на прахадной завод. Пасля продажу незапатрабаванай нерухомасці завод дэмантаваў помнік. Знікненне камуністычнага знака адміністрацыя завода не каментавала. Пасля пачатку расійскай ваеннай агрэсіі супраць Украіны станкабудаўнічае прадпрыемства атрымала крэдыты з РФ і стала працаваць на расійскі ваенпрам. Помнік Кіраву быў адноўлены на закрытай тэрыторыі ў двары адміністрацыйнага корпуса на

[356] https://t.me/ontnews/159927
[357] https://amp-euroradio-fm.cdn.ampproject.org/c/s/amp.euroradio.fm/grodzenskaya-prakuratura-patrabue-udaskanalic-gistoryka-kulturny-turyzm
[358] https://belta.by/regions/view/primer-mnogim-pokolenijam-bjust-geroja-sovetskogo-sojuza-pavla-romanova-otkryli-v-beshenkovichah-664553-2024/

невялікім пастаменце. Дырэктар прадпрыемства Анатоль Савянок лічыць, што такім чынам *«гістарычная справядлівасць перамагла»*[359].

***

**Былы палітвязень Кірыл Іваноў расказаў пра расійскі трыкалор, сцяг СССР, партрэты Сталіна і Дзяржынскага ў кабінеце ГУБАЗіК.**
Восенню 2023 года да мінчука Кірыла Іванова ў кватэру ўварваліся сілавікі. Падчас затрымання яго моцна збівалі электрашокерам. Далей Кірыла павезлі на допыт у аддзяленне ГУБАЗіК. У аддзяленні вісеў расійскі трыкалор і сцяг СССР, а таксама партрэты Сталіна і Дзяржынскага. *«Мяне гэта вельмі засмуціла. Не беларусы гэта»,* — падзяліўся Кірыл[360].

***

**Былы палітвязень Аляксей Кірэеў расказаў, што ў калоніі пад Магілёвам спалілі дзве тачкі беларускіх кніг і ўсяго Оруэла.**
Мінулым месяцам з калоніі № 15 вызваліўся былы палітвязень Аляксей Кірэеў, які адбыў у ёй асноўную частку свайго тэрміну ў 2 гады зняволення паводле 342 артыкулу КК. Аляксей Кірэеў расказаў, што ў калоніі спалілі большасць беларускіх кніг, а таксама вядомыя раманы Джорджа Оруэла «Ферма» і «1984». *«Усе ведалі, дзе стаяць беларускія кнігі — на палічках проста каля бібліятэкара. Памятаю, там быў збор твораў Максіма Гарэцкага, яшчэ было шмат кніг маладых аўтараў. Ужо нічога няма. І кніг па гісторыі, асабліва тых, што выдадзеныя ў пачатку 90-х гадоў, нічога няма. Гэта здарылася недзе ў сакавіку. Потым хлопцы з качагаркі расказалі, што да іх прывезлі дзве тачкі кніг і ўсё загадалі спаліць. Там былі і кнігі Оруэла — "Ферма", "1984". Прычым не па адным экзэмпляры, а па некалькі. Усё пайшло ў топку. Пры мне беларуская паліца ў бібліятэцы была амаль пустая»,* — расказаў Аляксей Кірэеў[361].

***

**Якуція прапанавала Беларусі супрацоўніцтва ў сферы кінавытворчасці.**
Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік Рэспублікі Саха (Якуція) Расіі Айсен Нікалаеў па выніках сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Ён падкрэсліў, што ў рэгіёне гатовы падтрымаць і іншыя ініцыятывы ў сферы гуманітарнага супрацоўніцтва[362].

[359] https://dq4st6gyfch82.cloudfront.net/ru/naviny/gomelskoe-podsankcionnoe-predprijatie-vernulo-pamjatnik-kirovu-na-territoriju-zavoda.html
[360] https://spring96.org/be/news/116335
[361] https://www.svaboda.org/a/33136102.html
[362] https://belta.by/culture/view/jakutija-vhodjaschaja-v-top-kinoproizvoditelej-rossii-predlozhila-belarusi-sotrudnichestvo-v-etoj-sfere-664857-2024/